Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — р. 90 к. На 3 месяцы — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтовага тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага тэксту 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Звыш тэрміну бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесправодны і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 169 (2658) Субота, 27-га ліпеня 1929 г.

154кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера, 13 Дзярж. Публічн. бібліят. студз. сьнежань адз'н экз.

Што выявіла праверка кіруючага складу.

У сучасны момант можна лічыць у асноўным скончанаю праверку кіруючага складу партыйных арганізацый. Усе даныя, якія ёсьць, даюць магчымасьць зрабіць некаторыя важныя вывады. Перш-на-перш гэтая праверка, якая праводзілася сябрамі ЦК і ЦКК, абудзіла вялікую актыўнасьць партыйных і беспартыйных мас. Гэтая праверка ўмацавала давер'е да кіруючага складу. Некаторыя маладыя сябры партыі ўпяршыню знаёміліся ня толькі з жыцьцяпісам кіраўнікоў партыйнай арганізацыі, але і з жыцьцём партыі ў цэлым. Увогуле вельмі рэдкімі былі выпадкі, калі праверка скочвалася да дробязяў бытавога жыцьця. Рабочыя і сяляне цікавіліся спэцыяльнымі і практычнымі пытаньнямі партыйнай палітыкі.

На вёсцы сяляне-сераднякі і беднякі выказвалі і выказваюць ня меншую зацікаўленасьць чысткаю партыі, а часам нават і большую, чымся ў горадзе. Перад масаю працоўных прайшлі і адмоўныя прыклады нягодных камуністаў, якія былі выключаны. Разам з тым пераважаючая большасьць (больш за 90 проц.) сяброў кіруючых партыйных арганізацый вытрымала гэтую праверку. Аднак, ня ўсюды праверка паказала добрыя вынікі ў адносінах складу праверанных. Больш за 7 проц. (у сярэднім) кіруючага складу атрымала партыйныя ўзысканьні ці вымовы пры праверцы. Асабліва слабымі ў гэтым сэнсе былі акраінныя арганізацыі. Найбольш здаровым усюды зьявіўся склад бюро камітэтаў, прэзыдыумаў і парткалегій кантрольных камісій. Але адначасна параўнаўча слабым зьявіўся склад вышэйшых партыйных органаў. Водлуг даных, якія ёсьць зараз, можна зрабіць адпаведныя вывады.

1. Неабходны больш уважлівы і суровы падбор кіруючых органаў, больш чулы адбор і незалежная праверка кандыдатур, якія вылучаюцца ў кіруючыя партыйныя ўстановы.

2. Партарганізацыі павінны праводзіць самую рашучую барацьбу са спрошчанаю практыкаю прадстаўніцтва ў кіруючых органах.

3. Неабходна будзе з прычыны звальненьня з кіруючых пасад некаторых працаўнікоў, зрабіць сям-там і перастаноўку сіл.

4. Трэба праводзіць больш рашучую барацьбу з выяўленьнем сямейнасьці ў падборы кіруючага складу.

5. Пры праверцы партыі можна з цьвёрдай упэўненасьцю сказаць, што асноўныя кіруючыя партыйныя кадры зьяўляецца здаровымі, бальшавіцкімі, ленінскімі кадрамі, але з мэтаю ўзмацненьня гэтых кадраў патрэбна больш уважлівае вылучэньне і больш сур'ёзнае выхаваньне новай зьмены кіраўнікоў.

6. Трэба яшчэ больш пашырыць сьвядомасьць і пачуцьцё адказнасьці кіруючага складу для правядзеньня лініі партыі за посьпех і недалікі сацыялістычнага будаўніцтва.

7. Для гэтага патрэбна, каб выяўленыя ў часе праверкі кіруючага складу недалікі ў дзейнасьці мясцовых арганізацый і памылкі асобных таварышоў былі бяз боязьні пабальшавіцку выпраўлены.

8. Неабходна яшчэ больш рашуча разгарнуць самакрытыку і ўнутрыпартыйную дэмакратыю.

9. Сябры кіруючых органаў павінны памятаць, што пасьля гэтай праверкі, калі рабочыя і сялянскія масы азнаёмяцца бліжэй са станам партыі, патрабаваньне ў адносінах асабовага і грамадзкага трыманьня, асабовых і грамадзкіх якасьцяў камуністаў, вылучаных да кіраўніцтва, павінна павялічыцца ў вялікай ступені. І, нарэшце, хоць гэтая задача зусім не зьяўляецца апошняю, неабходна, каб недалікі праверкі, прапушчаныя ў гэты першы пэрыяд, былі выпраўлены ў далейшым і асабліва, каб была выпраўлена слаба разгорнутая вярбоўка рабочых, батракоў і беднякоў у рады кампартыі. Толькі пры выкананьні гэтых умоў партыя здолее выкарыстаць пасапраўднаму выяўленыя вынікі праверкі кіруючага складу партыйных арганізацый. Ад узмацненьня кіруючых кадраў залежыць посьпех усяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

„Правда".

На фронце клясавае барацьбы.

Бойкі фашыстаў з рабочымі.

БЭРЛІН, 25-VII Нацыянал-сацыялісты (фашысты), узброеныя гумовымі дубінкамі, накінуліся на 18 камуністаў, якія варочаліся ў Бэрлін пасьля агітацыйнага падарожжа на правінцыі і зьбілі іх. Рабочыя не засталіся ў даўгу, здарылася свалка, у часе якой паранена 4 фашысты.

У Цьвіку (Саксонія) некалькі сотняў узброеных фашыстаў напалі на камуністычную дэманстрацыю пратэсту проці захопу ўрадам Чан-Кай-Шы Усходня-Кітайскай чыгункі. Некалькі дэманстрантаў паранена.

У Браслаўлі адбываўся збор агульных арганізацый, які праводзіўся пад лёзунгамі барацьбы з імпэрыялістычнай вайной і на абарону СССР. Паліцыя зрыштавала некалькіх удзельнікаў дэманстрацыі за тое, што некаторыя з іх былі ў вопратцы саюзу Чырвоных Франтавікоў.

„Злачынныя адносіны да беспрацоўных".

ЛЕНДАН, 24-VII. Рэйтэр паведамляе: „Сёньня ў палаце вобшчын дрэнна апрануты мужчына з залі для публікі кінуў пачку лістовак у залю пасяджэньняў, выгукнуўшы: „Я абвінавачваю ўрад у злачынных і ганебных адносінах да беспрацоўных". Парляманцкія вартаўнікі схапілі і вывелі яго. Абараняючыся, ён праз увесь час крычаў аб прасьледаваньнях беспрацоўных урадам рабочай партыі.

Агульнаангельскі кангрэс жанчын-работніц.

БЭРЛІН, 24-7. Агульнаангельскі кангрэс жанчын-работніц адбудзецца 6-га кастрычніка. Агалошана адозва, якая заклікае жанчын-работніц абіраць дэлегатак на кангрэс.

Вобыскі і арышты ня спыняюцца.

ПАРЫЖ, 25-7. З Брусэлю паведамляюць, што вобыскі ў памяшканьні кампартыі, Мопр'у і ў некаторых рабочых кватэрах учыніла паліцыя. Шмат камуністычных дзеячоў, 5 з якіх знаходзіцца пад арыштам, аддадзена пад суд.

Адналітнасьць шэрагаў Рурскай арганізацыі кампартыі.

БЭРЛІН, 23-7. У Эсэне адбылася канфэрэнцыя 500 партыйных працаўнікоў Рурскай арганізацыі нямецкай кампартыі. З дакладам аб пастановах зьезду нямецкай кампартыі і пленуму выканкому Камінтэрну аб працы ў прафсаюзах выступіў т. Мэкер. Ён асабліва падкрэсьліў, што барацьба проці пагрозы імпэрыялістычнай вайны павінна быць, галоўным чынам, увязана з працаю камуніста на прадпрыёмствах і ў прафсаюзах.

Канфэрэнцыя аднагодна, пры адным, які ўстрымаўся, ухваліла прапанаваную ЦК рэзалюцыю па пытаньні аб ваеннай небясьпецы і аб тактыцы прафсаюзнай працы.

Пры вобыску сэкратарыяту ЦК кампартыі ўзломаны шафы і сталы.

ПРАГА, 24-VII. Паліцыя ачапіла памяшканьне сэкратарыяту чэхаславацкай кампартыі, зрабіла ў памяшканьні вобыск, які цягнуўся каля 2-х гадзін. У часе вобыску паліцыя ўзламала пазамыканыя сталы і шафы. Уся знойдзеная ў памяшканьні пераписка і друкаваныя матар'ялы былі забраны паліцыяй. Матар'ялу, забранага пры вобыску, было так многа, што для перавозкі яго давялося выклікаць грузавік.

На 2 кангрэсе лігі барацьбы з імпэрыялізмам.

Зраўняць правы нэграў з белымі.

ФРАНКФУРТ на МАЙНЕ, 25-VII. На пасяджэньні кангрэсу антыімпэрыялістычнай Лігі барацьбы проці імпэрыялізму і прыгнечаньня калёніяльных народаў абмяркоўвалася ўсебрытанскае пытаньне. Дакладчык — прадстаўнік нэгрыцянскага рабочага камітэту Злучаных Штатаў Форд падкрэсьліваў, што неабходна дамагацца поўнага зраўнаньня ў правох нэграў з белымі ва ўсіх галінах гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцьця.

Амэрыка апранаецца ў „пацыфісцкую вопратку.

ВАШЫНГТОН, 24-7. Прэзыдэнт Гувэр агаласіў паведамленьне аб тым, што ён намеран назначыць спэцыяльную камісію для абмеркаваньня пытаньня аб скарачэньні вайсковых выдаткаў. Адзначаючы, што выдаткі Злучаных Штатаў на армію і флёт перавышаюць вайсковыя выдаткі іншых дзяржаў, Гувэр заяўляе, што неабходна на магчымасьці скараціць іх, «поўнасьцю захоўваючы належную падрыхтаванасьць».

У палітычных колах лічаць, што гэтыя заявы Гувэра павінны падкрэсьліць пацыфісцкі характар надыходзячай дэрэманіі абвяшчэньня наданьня правамоцнасьці пакту Келёга.

ПАКТ КЕЛЁГА НАБЫЎ МОЦ.

ВАШЫНГТОН, 24-7. Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Гувэр абвясьціў пакт Келёга правамоцным.

ВЫКОНВАЮЧЫ ВОЛЮ ШЫРОКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС, УРАД ВЫПУШЧАЕ III ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

ДЛЯ ХУТЧЭЙШАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І ЎЗМАЦНЕНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ.

Пастанова ЦВК і СНК СССР аб выпуску III дзяржаўнай унутранай пазыкі індустрыялізацыі народнай гаспадаркі СССР.

З мэтаю павялічыць сродкі, якія аддаюцца на індустрыялізацыю прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Выпусьціць дзяржаўную ўнутраную пазыку на падставах, пададзеных у гэтай пастанове.

2. Пазыка запісваецца ў кнігу дзяржаўных пазык Саюзу ССР пад назвай „3-я дзяржаўная ўнутраная выйгрышная пазыка індустрыялізацыі народнай гаспадаркі Саюзу ССР".

3. Сумы, атрыманыя ад рэалізацыі пазыкі, перадаюцца на індустрыялізацыю народнай гаспадаркі Саюзу ССР.

4. Ад усёй рэалізаванай па пазыцы сумы, 10 проц. адлічваецца на патрэбы мясцовага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Парадак разьмеркаваньня і скарыстаньня паказанага адлічэньня вызначаецца інструкцыяй якая зацьвярджаецца Саветам Працы і Абароны па падачы Народнага Камісарыяту Фінансаў Саюзу ССР.

5. Пазыка выпушчаецца на суму семсот пяцьдзесят мілёнаў руб. двума выпускамі. Адзін выпуск пазыкі на суму ў дзьвесьці пяцьдзесят мілёнаў руб. зьяўляецца процантна-выйгрышным; прыбытак па аблігацыях гэтага выпуску выплачваецца часткаю ў выглядзе процантаў, часткаю ў выглядзе выйгрышаў. Другі выпуск пазыкі на суму ў пяцьсот мілёнаў руб. зьяўляецца бяспроцантна-выйгрышным; увесь прыбытак па аблігацыях гэтага выпуску выплачваецца ў выглядзе выйгрышаў.

6. Процантна-выйгрышны выпуск пазыкі падзяляецца на пяць разрадаў па пяцьдзесят мілёнаў руб. кожны, бяспроцантна-выйгрышны выпуск падзяляецца на дзесяць разрадаў па пяцьдзесят мілёнаў руб. кожны. Кожны разрад у сваю чаргу падзяляецца на сто тысяч сэрый, па дзесяць аблігацый на суму пяцьсот руб. у кожнай сэрыі.

7. Пазыка выпушчаецца ў поўных (непадзеленых) і падзеленых на часткі аблігацыях коштам па пяцьдзесят руб. кожная аблігацыя. Падзеленыя аблігацыі выпушчаюцца двух выглядаў: з падразьдзяленьнем кожнай аблігацыі на дзьве роўныя часткі намінальным коштам у дваццаць пяць рублёў кожная; і з падразьдзяленьнем кожнай аблігацыі на дзесяць роўных частак, намінальным коштам у пяць руб. кожная. Асобныя часткі падзеленых аблігацый нумаруюцца асобным нумарам і прадаюцца самастойна. Палова падзеленай аблігацыі (25 р. намінальных) дае права на палову прыпаўшага на аблігацыю выйгрышу, а па процантна-выйгрышным выпуску—і на палову належнага на поўную аблігацыю процантнага прыбытку. Дзесятая частка падзеленай аблігацыі (5 руб. намінальных) дае права на дзесятую частку выйгрышу, які прыпаў на аблігацыю, а па процантна-выйгрышным выпуску—і на адну дзесятую частку належнага на поўную аблігацыю процантнага прыбытку.

8. Пазыка выпушчаецца тэрмінам на 10 гадоў, з 1-га сьнежня 1929 году да 1-га сьнежня 1939 году.

9. Па аблігацыях процантна-выйгрышнай пазыкі налічаюцца процанты ў разьмеры шасьці гадавых. Выплата процантаў робіцца раз у год за мінулы гадавы пэрыяд па купону, які мае тэрмін 1-га сьнежня кожнага году, пачынаючы з 1-га сьнежня 1930 году.

10. На працягу шэрэгу, паказанага ў арт. 8, па кожным выпуску пазыкі праводзіцца 38 тыражоў выйграшаў, па 4 тыражы ў кожны гадавы пэрыяд, апроч апошняга году, у які праводзіцца два тыражы.

11. Для кожнага выпуску пазыкі ўстанаўляюцца выйгрышы ў 200 р., 1000 р. і 5 тысяч р. Колькасьць выйгрышаў для кожнага выпуску розная і ўстанаўляецца па кожным разрадзе кожнага выпуску.

12. Аблігацыя, на якую прыпаў выйгрыш, згашаецца і выключаецца з далейшых тыражоў выйгрышаў. Трымацелю яе выплачваецца, апроч выйгрышу, (арт. 11), намінальны кошт аблігацыі.

Па аблігацыях процантна-выйгрышнага выпуску, якія выходзяць у тыраж выйгрышаў, налічэньне процантаў спыняецца са дню пачатку адпаведнага тыражу. Трымацелям такіх аблігацый, апроч выйгрышу і намінальнага кошту аблігацыі, выплачваюцца процанты, якія налічаны па бягучаму купону да дню тыражу.

13. Апроч выхаду ў тыраж аблігацый, на якія прыпалі выйгрышы (арт. 12), пазыка згашаецца праз пяць тыражоў згашэньня.

Тыражы згашэньня праводзяцца раз у год, пачынаючы з 1935 году, у тэрміны, устаноўленыя Народным Камісарыятам Фінансаў Саюзу ССР, аднак, не пазьней 1-га сьнежня кожнага году. У кожным з першых двух тыражоў згашаецца па 13 тысяч сэрый у кожным разрадзе, а разам па 65 тысяч сэрый процантна-выйгрышнага выпуску пазыкі і па 130 тысяч сэрый бяспроцантна-выйгрышнага выпуску (195 сэрый за тыраж); у трэцім тыражы згашаецца па 22 тысячы сэрый у кожным разрадзе, а ўсяго 110 тысяч сэрый процантна-выйгрышнага выпуску (330 сэрый за тыраж). У апошніх 2-х тыражох згашаецца па 26 тысяч сэрый у кожным разрадзе, а ўсяго 130 тысяч сэрый процантна-выйгрышнага выпуску і 260 тысяч сэрый бяспроцантна-выйгрышнага выпуску (390 тысяч сэрый за тыраж).

14. Гаспадару вышаўшай у тыраж згашэньня аблігацыі (арт. 13) выплачваецца намінальны кошт яе з 1-га сьнежня таго году, у якім адбываўся адпаведны тыраж згашэньня. З гэтага-ж тэрміну спыняецца налічэньне процантаў па вышаўшых у тыраж аблігацыях процантна-выйгрышнага выпуску. З таго-ж тэрміну аблігацыі, якія выходзяць у тыраж згашэньня, у далейшых тыражох выйгрышаў ня ўдзельнічаюць.

15. Парадак і ўмовы рэалізацыі пазыкі, тэрміны і парадак адбываньня тыражоў выйгрышу і тыражоў згашэньня (арт. арт. 10 і 13) устанаўляюцца Народным Камісарыятам Фінансаў СССР.

16. Аблігацыі пазыкі, прыбыткі ад іх, у тым ліку выйгрышы, а таксама зьдзелкі з аблігацыямі пазыкі вызваляюцца ад ападаткаваньня ўсімі агульнадзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і зборамі.

17. Аблігацыі пазыкі могуць вольна закупляцца і прадавацца.

18. Аблігацыі пазыкі прымаюцца ў заклад па дзяржаўных падрадах і пастаўках, а таксама ў забясьпеку выплаты растэрмінаваных акцызаў і мытаў па курсу, устаноўленым Народным Камісарыятам Фінансаў СССР.

19. Арэндатарам дзяржаўнай, у тым ліку камунальнай маемасьці (зямельных і лясных вучасткаў, прамысловых прадпрыёмстваў і г. п.), надаецца права закладаць аблігацыі пазыкі ў забясьпячэньне арэндных угавораў па курсу, які ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Фінансаў СССР.

20 Для атрыманьня намінальнага кошту вышаўшых у тыраж аблігацый (арт. арт. 12 і 14) выйгрышаў (арт. 11), а таксама процантнага прыбытку, які выплачваецца ў парадку арт. 12 адначасна з выплатаю выйгрышу, устанаўляецца дзесяцігадовы тэрмін з дню адпаведнага тыражу згашэньня ці тыражу выйгрышаў. Для аплаты купонаў прамінулых тэрмінаў (арт. 9) устанаўляецца дзесяцігадовы тэрмін з дню надыходу тэрэіну купону.

Пасьля сканчэньня пералічаных у гэтым артыкуле тэрмінаў гаспадары аблігацый пазыкі і купонаў трацяць права на атрыманьне адпаведных сум.

СТАРШЫНЯ ЦВК СССР М. КАЛІНІН.
НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ СНК СССР В. ШМІДТ.
СЭКРАТАР ЦВК СССР А. ЭНУКІДЗЕ.

У бяспрытульных пад мостам Панятоўскага.

(Ад нашага карэспандэнта у Варшаве.)

Зруйнаваньні сусьветнай вайны выклікалі ва ўсёй Эўропе востры кватэрны крызіс, які ў капіталістычных умовах усім сваім цяжарам усклядаецца на працоўныя масы. Але нідзе ў сьвеце, здаецца, гэты крызіс ня мае такіх нячуваных форм, як у Панскай Польшчы. У адной толькі Варшаве каля 3000 сем'яў валяцца бяз прытулку. І гэта ў той час, калі вялікія палацы і віллы ў Варшаве займаюць асобныя багатыры, а буржуазныя сем'і маюць кватэры па 5 і па 10 пакояў.

Апавяданьні бяспрытульных аб сваім жыцьці гэта аповесьць аб тым, як капіталізм, аздоблены панствам, распраўляецца з рабочым чалавекам.

Жудасная аповесьць. Аб гэтым гаворыць ужо знадворны выгляд логаваў, дзе жывуць гэтыя бяспрытульныя, хоць-бы пад мастом Панятоўскага. Тут туліцца 12 сем'яў. Некаторыя з іх валяюцца ўжо на працягу 2 месяцаў, рэшта—па 3-5 тыдняў. Іхнія логавы—гэта нешта накшталт шатроў, сьценкі якіх зроблены з старых мяхоў, абадраных коўдраў і брудных пасьцілак. Дым і чад ад маленькіх пячурак засьціць вочы. У прамежках між гэтымі шатрамі стаяць калыскі з малымі дзецьмі, доле валяюцца дзеці і гаспадараць змарнелыя жанчыны. Хто скрабе бульбу, хто латае вопратку.

Жыхары гэтага жахлівага табару—людзі досыць сымпатычныя. У апавяданьнях пра сваё жыцьцё яны, як відаць, знаходзяць палегчаньне сваім пакутам.

Вось логава, куды забраліся 3 сям'і з 15-ці асоб. Жанчына—скура ды косьці—7 месяцаў назад нарадзіла дваіх, сіплым голасам апавядае, як яна апынулася тут. Муж яе—стальмах. Год ён быў без працы. Потым захварэў і 8 месяцаў знаходзіўся і шпіталі. Раней яны займалі адзін невялічкі пакойчык, але вось 8 месяцаў ня здолелі плаціць за кватэру (172 злотых, злоты—20 капеек). Гаспадар атрымаў праз суд выканаўчы ліст на высяленьне. Мы прапанавалі,—кажа жанчына,—выплачваць яму па 10 злотых у тыдзень, але ён патрабаваў адразу 400 злотых (замест 172, бо яму каштаваў грошы правабаронца і іншыя судовыя страты). І гаспадар выкінуў іх з кватэры, не дазволіўшы нават заставацца ў панадворку. Так яны апыніліся пад мастом.

Другая сям'я гэтага логава складаецца з 5-ці асоб: муж, жонка і трое дзяцей, з якіх старэйшаму 7 гадоў, а малодшаму 6 месяцаў. Муж—чорнарабочы. Раней яны займалі кут у маленькім пакойчыку ў шаўца, які таксама меў жонку і некалькі дзяцей. Апроч таго, шавец здаваў і іншыя куты. У пакойчыку было пекла. Бруд, вошы, клапы. Спалі на падлозе, скрынках, тапчанох, нават седзячы. Усе-ж такі не хапала месца для ўсіх кватарантаў гэтага пакойчыку і даводзілася рабіць „зьмены". У той час, як адны спалі,—іншыя выходзілі з пакою. Да ўсяго гэтага гаспадар быў п'яніца. Урэшце, нават гэтае „шчасьце" скончылася. Шавец прынёс выканаўчы ліст аб высяленьні з прычыны цеснаты ў пакоі. Сапраўды-ж ён хацеў пусьціць замест гэтай сям'і новых кватарантаў, якія яму абяцалі больш платы. Вось ужо 5 тыдняў, як гэтая сям'я валяецца пад мостам. Яе нават пазбавілі данамогі ад беспрацоўя, бо... яна не прапісана, ня маючы месца для жыцьця.

Гісторыя гэтых 2-х сем'яў—тыповая амаль што для ўсіх бяспрытульных. Мізэрны заработак, хцівасьць дамаўласьнікаў, бязьлітасьнасьць суду, які стаіць на варце „сьвяшчэннай уласнасьці"—чырвонаю істужкаю праходзіць праз усе гэтыя гісторыі.

Сярод абываталяў логаваў пад мостам ёсьць таксама і „былыя" людзі.

Вось сівая жанчына з арыстакратычным тварам апавядае сваю аповесьць. Яе муж быў багатым інжынэрам—братам вядомага польскага пісьменьніка **Навакоўскага**. «Мая сям'я,—з гонарам заяўляе яна,—паходзіць ад выдатнага польскага кампазытара **Манюшкі**". Раней гэтая жанчына з мужам жыла ў Харкаве. У часе грамадзянскай вайны муж яе быў забіты. Дзеці раскіданы па ўсім сьвеце. Ледзь удалося ёй выехаць у Польшчу. Але толькі тут пачалося для яе сапраўднае пекла. „Там у Расеі,—сказала яна,—калі адзін меў кватэру з 6 пакояў, а другі ня меў ніяк, дык такую кватэру падзялялі. Няхай цесна, але кожны мае свой куток. А тут..." і яна з нянавісьцю і слобаю загаварыла пра парадкі, якія пануюць у «вольнай» Польшчы. **А. Р.**

Праезд нямецкай рабочай і піанэрскай дэлегацыі праз Негарэлае ў Маскву.

(Ад нашага карэспандэнта).

НЕГАРЭЛАЕ, 26-7. Учора ўначы праз Негарэлае праехала ў Маскву нямецкая дэлегацыя для ўдзелу ў сьвяткаваньні Міжнароднага Чырвонага Дню. У складзе дэлегацыі—6 рабочых, з якіх 5 камуністаў і адзін беспартыйны. Усе дэлегаты зьяўляюцца ўдзельнікамі баёў першага мая ў Бэрліне. Чатыры з іх былі ў гэтых бойках ранены.

Пасьля сьвяткаваньня дэлегаты паедуць на адзін з паўднёвых курортаў. Дэлегаты едуць на сродкі бэрлінскага МОПР'у.

* * *

Учора ўначы праехала праз Негарэлае ў Маскву на піанэрскі зьлёт дэлегацыя юных спартакаўцаў—прадстаўнікоў Бэрліну, Мюнхэну, Гесэну, Франкфурту і інш. гарадоў.

Яны байкатуюць буржуазны зьлёт скаутаў у Ліверпулі.

Дэлегаты едуць дзеля азнаямленьня з бытам піанэраў у СССР, каб пасьля выкрыць ману і хлусьню, якая распаўсюджваецца буржуазнай прэсай аб СССР.

ХВАЛЯ ПРАТЭСТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БССР

СУПРОЦЬ БАНДЫЦКАГА ЗАХВАТУ УСХ.-КІТ. ЧЫГ.

ПРЭЧ АКРЫВАЎЛЕНЫЯ ЛАПЫ АД КРАІНЫ САВЕТАЎ!

Агульны сход працоўных Полацкага акруговага дарожнага аддзелу заўважае, што працуючы на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, рабочыя ніколі не забывалі пра абарону сваёй бацькаўшчыны і гатовы даць рашучы адпор дранежнікам.

Рабочыя ўхвалілі падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і садзейнічаць шырокаму распаўсюджаньню яе.

* * *

Рабочыя фабрыкі „Дняпроўская Мануфактура" і працоўныя г. Дуброўны выказваюць сваю гатоўнасьць грудзьмі адстаяць заваёвы Кастрычніка і абяцаюць узмацніць працоўную дысцыпліну, узьняць вытворчасьць і ўсім, як адзін, падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

* * *

Працоўныя мястэчка Старобіну (Бабруйскай акругі) і працоўнае сялянства гэтага райёну ў колькасьці 1500 чал. катэгарычна пратэстуюць супроць бандыцкага наскону на Усходня-Кітайскую чыгунку і заяўляюць, што пад кіраўніцтвам УсеКП(б) дадуць рашучы адпор сусьветнаму імпэрыялізму. Яны вітаюць таксама пастанову Ураду аб выпуску 3 пазыкі індустрыялізацыі, якая дасьць магчымасьць узмацніць нашу магутнасьць і абароназдольнасьць краіны.

* * *

Працоўныя Крупшчыны (Аршанскай акругі) ганьбяць бандыцкі наскон на Усходня-Кітайскую чыгунку агентаў сусьветнага імпэрыялізму і заяўляюць: „Усе жрані, якія зрабіў наш урад, мы поўнасьцю адабраем і падтрымліваем і гатовы на першаму закліку са зброяй у руках выступіць на абарону сацыялістычнай краіны.

Вітаем пастанову Ураду аб выпуску 3-й пазыкі індустрыялізацыі і абяцаем аддаць усе сілы на яе рэалізацыю".

У Саюзных Рэспубліках.

Кітайскае пасольства выехала з СССР.

МАСКВА, 26-VII. 24-га ліпеня ўвесь склад кітайскага пасольства ў Маскве на чале з часовым даверанным у справах выехаў праз Ленінград у Фінляндыю. Перад гэтым кітайскае пасольства здало ўсе свае архівы, маемасьць і справы нямецкаму пасольству, якое ўзяло на сябе абарону кітайскіх грамадзян у СССР.

Савецка-амэрыканскае тэхнічнае супрацоўніцтва.

МАСКВА, 26-VII. Сябры амэрыканскай гандлёва-прамысловай дэлегацыі, віцэ-прэзыдэнт буйнай амэрыканскай будаўнічай фірмы „Афтын і К°" Брандт і інжынэр фірмы містэр Кольман зрабілі Галоўмашбуду канкрэтную прапанову аб умовах удзелу фірмы ў тэхнічным кіраваньні будаўніцтвам ніжагародзкага аўтазаводу. Фірма знаходзіць магчымым узяць на сябе складаньне праэктаў будаўнічых работ, кіраўніцтва работамі, гарантуе кляткавае пабудаваньне заводу за 15 месяцаў.

Для кіраваньня работамі фірма намерана прысłаць на будаўніцтва 14 высокакваліфікаваных інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. Начальнік Галоўмашбуду Талаконцаў зазначыў, што гарантуемы фірмай тэрмін сканчэньня будаўніцтва аўтазаводу здавальняе ВСНГ. Наконт умоў аплаты Галоўмашбуд дасьць адказ гэтымі днямі.

Знойдзены залежы каменнага вугалю.

САМАРА, 25-VII. За 15 кілёмэтраў ад Уралу на мяжы Аранбурскай акругі выкрыты значныя пластэрады каменнага вугалю на абшары ў 40 кілёмэтраў і таўшчынёю ў 1 мэтр. Узоры вугалю пасланы на дасьлед.

НА ФРОНЦЕ БАРАЦЬБЫ ПЕРАД 1 ЖНІЎНЯ

ПРОЦІ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ.

ПАРЫЖ, 25-7. Бэльгійская кампартыя агаласіла новую адозву да працоўных і салдат з заклікам выйсьці на вуліцу 1 жніўня ў цэнтр гораду, каб выступіць на абарону СССР, проці імпэрыялістычнай вайны, за паляпшаньне ўмоў жыцьця рабочай клясы. Кампартыя заклікае таксама да ўдзелу ў міжнароднай антываеннай дэманстрацыі, якая адбудзецца 28 ліпеня ў Ахене.

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗАБАРОНУ, ІДЗЕ ПАДРЫХТОЎКА ДА 1 ЖНІЎНЯ.

ПАРЫЖ, 25-7. Не зважаючы на рэпрэсіі, рабочыя арганізацыі ня спыняюць падрыхтоўкі да 1-га жніўня. 21 ліпеня ў некаторых правінцыйных гарадох адбыліся рабоча-сялянскія зьезды.

НЯ СПЫНЯЦЬ РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ.

ПАРЫЖ. Адбылася канфэрэнцыя рабочых і служачых дзяржаўных устаноў, пошт і тэлеграфаў, чыгуначных кампаній, муніцыпальных прадпрыёмстваў, вадаправодаў, газавых заводаў, электрычных станцый, больніц і г. д. Прысутнічала 250 дэлегатаў. Канфэрэнцыя аднагодна ўхваліла рэзалюцыю, у якой заклікае ўсіх рабочых і служачых прыняць далейшы ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні дню 1-га жніўня, а таксама ня спыняць рашучай барацьбы за свае эканамічныя патрабаваньні.

* * *

ПАРЫЖ, 26-7. Арыштаван быўшы на працягу 2-х гадоў адказны рэдактар „Юманітэ" па абвінавачаньні ў закліку вайсковых служачых да непадначаленьня.

* * *

АТЭНЫ, 25-7. У зьвязку з падрыхтоўкаю да міжнароднага чырвонага дню арыштаваны рабочыя, якія належаць да кампартыі і забаронены ўсе сходы пад адкрытым небам і ў зачыненых памяшканьнях.

* * *

ВАРШАВА, 25-7. У зьвязку з падрыхтоўкаю чырвонага дню, у рабочых раёнах Варшавы вывешаны плякаты і транспаранты, перакінутыя праз правады, з заклікам да дэманстрацыі 1-га жніўня. Пажарная каманда пад кіраўніцтвам паліцыі паздымала плякаты.

У Заходняй Беларусі адбыліся масавыя мітынгі і дэманстрацыі з удзелам 5 тысяч чалавек, якія разганяліся паліцыяй, але пасьля гэтага ізноў працягваліся.

РУМЫНІЯ, ЮГАСЛАВІЯ І ІНШЫЯ „САЮЗЬНІКІ" ПАТРАБУЮЦЬ СВАЕЙ ЧАСЬЦІ.

ПАРЫЖ, 24-7. Румынскі міністр замежных спраў Міранэску, які знаходзіцца ў Парыжы, заявіў Брыяну, што Румынія і іншыя ўсходня-эўрапейскія саюзьнікі Францыі не здаволены разьмерамі той часткі рэпарацыйных выплат, якая прыпадае ім згодна пляну Юнга. Водлуг вестак „Эко-дэ-Пары", Югаславія і Грэцыя паслалі французскаму ўраду мэмарандум, які патрабуе павялічэньня разьмераў прадугледжанай для іх часткі рэпарацыйных выплат.

Рабочыя патрабуюць неадкладна аднавіць зносіны з СССР

Л�ёНДАН, 25-7. Дэлегацыя аб'яднаньня прафсаюзаў рабочых машынабудаўнічай і суднабудаўнічай прамысловасьці, якая наведалася да Гэндэрсона, перадала яму рэзалюцыю аднагодна ўхваленую канфэрэнцыяй, у якой удзельнічалі прадстаўнікі выканкому усіх прафсаюзаў рабочых машынабудаўнічай і іншых галін прамысловасьці.

Рэзалюцыя „настойліва зварочвае ўвагу ўраду на неабходнасьць паскорыць аднаўленьне дыпляматычных і гандлёвых зносін з СССР"; яна-ж заяўляе, што гэтыя зносіны трэба адкласьці перад перарывам сэсіі парляманту

Фашысты заклікаюць урад „быць рашучым".

ТОКІЁ, 24-7. Фашысцкая „Янато" нападае на Шыдэхару, заявяраючы, што яго палітыка мала энэргічная для захаваньня японскіх пазіцый, бо, калі Амэрыцы будзе дазволена ўмешвацца ў Манчжурскія справы, дык Японія страціць сваю пануючую ролю на Далёкім Усходзе.

ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЮ

15 ГОД НАЗАД ІМПЭРЫЯЛІСТЫ РАСПАЛІЛІ ВАЙНУ. МІЛЬЁНЫ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ЗАГІНУЛІ. НАРОДНЫЯ МАСЫ БЫЛІ ДАВЕДЗЕНЫ ДА ЖАБРАЦТВА І РАЗБУРЭНЬНЯ. ІМПЭРЫЯЛІСТЫ Ў САЮЗЕ З САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЯЙ РЫХТУЮЦЬ НОВУЮ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНУЮ ВАЙНУ СУПРОЦЬ СССР.

ПРЭЧ АРГАНІЗАТАРАЎ ВАЙНЫ! НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ!

Як яны рыхтуюцца.

Капіталістычныя дзяржавы гатовы, зламаўшы галаву, кінуцца ў крывавыя бойкі. Узаемная барацьба, вайна з савецкай сацыялістычнай дзяржавай і бязьлітасная расправа з паўстаўшымі падняволенымі народамі — вось да чаго бязупынна рыхтуюцца буржуазныя дзяржавы.

Іх падрыхтоўка, раней за ўсё, ідзе ва лініі намнажэньня і апрацоўкі жывой сілы. Францыя, Англія, Італія, Злучаныя Штаты і Японія маюць зараз у сваіх арміях на 300 тысяч салдат больш, чымся ў 1913-1914 г.— да першай сусьветнай вайны. Аднак, ножная армія ў сучаснай вайне павінна бязупынна папаўняцца. Дзеля гэтага падрыхтоўка жывой сілы накіроўваецца на ўтварэньне мілённых запасаў вывучаных людзей. У гэтых пяцёх вялікіх дзяржавах сучасныя людзкія запасы складаюць каля 20 мілёнаў чалавек, у той час, як у 1914 г. іх запас не перавышаў 8 мілёнаў. Нашы суседзі — Фінляндыя, Эстонія, Літва, Латвія, Польшча і Румынія павялічылі свае арміі, у параўнаньні з 1923 г., на 84 тысячы. Цяпер маюць запас у 5 мілёнаў байцоў.

Аднак, падрыхтоўку жывой сілы нельга абмежаваць толькі павялічэньнем запасу. Трэба падрыхтоўваць кадры да шырокага разгортваньня армій. Вось чаму капіталістычныя дзяржавы імкнуцца пашырыць шэрагі прафэсыяналаў і шэрагі фашысцкіх арганізацый. Калі ў францускай арміі ў 1913 годзе было 34 проц. прафэсыяналаў, дык зараз там прафэсыяналаў-вяякаў каля 50 проц. Нашы суседзі маюць у сваіх ваенна-фашысцкіх саюзах больш мілёна членаў.

Узмоцненая падрыхтоўка да вайны ідзе па лініі ваеннай тэхнікі. Сродкі для бою і дапаможныя армейскія тэхнічныя сродкі ня толькі павялічваюцца, але і ўдасканальваюцца. Так, за ўвесь час сусьветнай вайны Францыя выпусьціла 3200 танкаў, у той час, як зараз ужо ў арміі мірнага часу Францыя мае каля 2000 танкаў.

Колькасна і якасна растуць вайсковыя марскія флёты буйных імпэрыялістычных дзяржаў. Так, да 1933 г. Англія будуе 16 новых крэйсэраў, Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты—23, прычым вялікую долю марскіх асыгнаваньняў Злучаныя Штаты зрабілі зараз-жа пасьля падпісаньня дагавору аб „забароне" вайны!

Акрамя рознастайнай падрыхтоўкі сваёй узброенай сілы, капіталістычныя дзяржавы дзейна рыхтуюць да вайны і свой тыл. Вядомы закон сацыял-здрадніка Поля Бонкура прымушае працаваць на вайну кожнага француза, калі толькі ён ня дзіця і «не выживший из ума» дзед. Ангельскія законы і законы іншых краін, накіраваныя проці прафэсыянальных саюзаў і рэвалюцыйных рабочых арганізацый, зьяўляецца мерамі падрыхтоўкі да вайны.

Вялізарную працу праводзіць буржуазея на падрыхтоўцы прамысловасьці. Так, напрыклад, Японія ўжо два гады праводзіць пробныя мабілізацыі. У гэтым годзе яе прамысловая мабілізацыя ахапіла тры прамысловыя прафэктуры.

Падрыхтоўкай новых войн служаць і тыя дагаворы і згоды, якія заключаюць дзяржавы буржуазеі паміж сабой. Гэткія ўмовы Лёкарно, англа-францускія, англа-японскія і іншыя, гэткія дагаворы паміж Францыяй і Польшчай, Францыяй і Румыніяй, Польшчай і Румыніяй, Польшчай і Чэхаславакіяй, Эстоніяй і Латвіяй.

Нарэшце, адным з найбольш яскравых паказальнікаў набліжэньня вайны служыць падрыхтоўка буржуазеяй грамадзкай думкі. З аднаго боку, капіталісты бязупынна гавораць аб разброеньнях, маскіруючы свае ўзброеньні. З другога боку—капіталістычныя групы вядуць прапаганду проці Савецкага Саюзу і сваіх імпэрыялістычных супраціўнікаў. Сацыял-дэмакратыя і іншыя «сацыялісты», як ніколі, старанна дапамагаюць утойваць ад працоўных мас адзнакі новай вайны і адначасова падрыхтоўваць гэту вайну. Траба толькі ўспомніць аб нямецкім сацыял-дэмакратычным браняносцы, каб зразумець ролю сацыял-здраднікаў у падрыхтоўцы новых войн.

І. Пермякоў

Міжнародны пралетарыят на варце Савецкага Саюзу.

У дні 15-ае гадавіны ўзнікненьня першай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны рэвалюцыйныя пралетарыі ўсяго сьвету заяўляюць, што ў выпадку спробы буржуазных урадаў і іх сацыял-дэмакратычных дапаможнікаў ажыцьцявіць свае „заветныя" мары—напад на СССР—шырокія масы працоўных, як адзін чалавек, усю сваю энэргію зварацяць на абарону СССР, на скасаваньне сваіх імпэрыялістычных урадаў, на ператварэньне ў сваёй краіне вымудраванай капіталістамі імпэрыялістычнай вайны проці СССР у вайну грамадзянскую проці камандуючых і эксплёатуемых клясаў.

Камуністычны Інтэрнацыянал і яго сэкцыі разгарнулі да 1-га жніўня гравдыёзную агітацыю і прапаганду. Мала таго, што пастаўлены на ногі ўсе камуністычныя арганізацыі ва ўсіх краінах з мэтаю ўцягнуць у рух магчыма большыя шырокія масы, але ўтвораны новыя, спэцыяльныя арганізацыі.

Праводзячы яшчэ нябылое ў гісторыі, зусім асабістае камуністычнае спаборніцтва, сэкцыі Камуністычнага Інтэрнацыяналу шукаюць новыя, асабістыя, найбольш адпавядаючыя для кожнай данай краіны формы ўцягваньня шырокіх мас працоўных у барацьбу проці вайны імпэрыялістаў.

У Нямеччыне па прадпрыёмствах, раёнах і акругах арганізаваны асабовыя «антываенныя камітэты». Абраныя ўпаўнаважаныя ад рабочых, якія ўваходзяць у камітэты, супольна з партыйнымі камітэтамі КПГ праводзяць мабілізацыю мас да дню 1-га жніўня. Ужо ў працягу шэрагу тыдняў пад кіраўніцтвам КПГ і камсамолу ідзе падрыхтоўчая арганізацыйная і агітацыйная праца. Быў праведзены шэраг частковых, падрыхтоўчых да 1-га жніўня кампаній. У выніку ўдалося ўскалыхнуць і ўцягнуць у кампаніі шырокія масы.

У Францыі, ня гледзячы на „свистопляску" рэакцыі, якая стварыла правакацыйную справу аб „загаворы", у якую спрабуюць заблытаць і ЦК партыі і, у першую чаргу, рэдакцыю „Юманітэ», падрыхтоўка да 1-га жніўня разгарнулася поўным ходам. Нашы францускія таварышы стараюцца раніць самае слабае месца францускага імпэрыялізму, арганізуючы братаньне рэвалюцыйных рабочых з салдатамі, навабранцамі і запаснымі. Работа ў арміі вядзецца ў Францыі досыць грунтоўна і тым самым падрывае тыя падставы, на якіх з даўнята часу трымаецца рэакцыя ў гэтай краіне. Рабоча-сялянскі зьезд Парыскага раёну па казаў, што ня так лёгка паліцэйскімі мерамі задушыць шырокі масавы рух.

У Скандынавіі клясавая барацьба за апошнія гады абвастрылася і адпаведна да гэтага ідзе і ўзмацнёная падрыхтоўка да Чырвонага Дню. Пасьля антываеннага рабочага кангрэсу ў Осло (Нарвэгія) прашоў у Гетэборзе кангрэс прадстаўнікоў пралетарыяту Швэдыі, Нарвэгіі, Даніі і Фінляндыі, які парашыў прыняць энэргічныя меры па згоднаму правядзеньню барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны і ў абарону СССР ва ўсіх краінах.

У Чэха-Славакіі, у Аўстрыі, у Швэйцарыі—ва ўсіх гэтых краінах праведзена ажыўленая работа па падрыхтоўцы Чырвонага Дню, якая ў некаторых выпадках натыкалася на вялізарныя цяжкасьці, паліцэйскія ганеньні, закрыцьце камуністычных газэт і г. д.

У Англіі, дзе шырокія рабочыя масы ідуць яшчэ за партыяй Макдональда і Гендэрсона,—падрыхтоўка да Чырвонага Дню разгарнулася поўным ходам. Папярэднія дэманстрацыі заклікаюць да правядзеньня 1-га жніўня аднадзённай забастоўкі. Дэманстрацыя 1-га жніўня будзе праводзіцца пад лёзунгам абароны СССР.

Атрыманыя з Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў весткі паказваюць, што і там ідзе ўзмацнёная праца на ўцягваньню рабочых мас да барацьбы з новай імпэрыялістычнай вайной і ў абарону СССР.

У краінах белага тэрору, дзе працоўныя масы стогнуць пад няволей фашызму—у Італіі, Баўгарыі, Вэнгрыі і Польшчы, ня гледзячы на ганеньні і прасьледваньні, узмацнёна ідзе падрыхтоўка да правядзеньня дэманстрацый у дзень 1-га жніўня. У рух уцягнута часткова і сялянства, узмоцнена нелегальная работа ў войсках. Дзень 1-га жніўня ў гэтых краінах будзе сур'ёзным крокам па шляху ўзмацненьня ў іх рэвалюцыйнага руху.

Ва ўсім сьвеце працоўныя масы, усьвядоміўшы, што новая імпэрыялістычная вайна пастаўлена буржуазеяй на парадак дню, узмоцнена мабілізуюць свае сілы. Гэтая мабілізацыя праводзіцца пакуль-што не дзеля паўстаньня не дзеля зьвяржэньня ўлады капіталу, а дзеля рэвалюцыйнай дэманстрацыі сваіх сіл і сваёй гатоўнасьці ў момант сур'ёзнай пагрозы грудзьдзю сваёй абараняць першую рэспубліку працоўных—СССР.

Фрыц Штурм.

„Падбухторваньне вайсковаслужачых да непаслушэнства".

Гэткі артыкул ёсьць ва ўсіх кодэксах законаў капіталістычных краін. Чым больш узмацняецца супраціўленьне працоўных пагрозе імпэрыялістычнай вайны, тым больш часта фігуруе гэты артыкул у шматлікіх працэсах рэвалюцыйных антымілітарыстаў. Краіны адкрытага фашызму і „шырокай дэмакратыі" спаборнічаюць паміж сабой у зьдзеках супроць антымілітарыстычнага друку і супроць рэвалюцыянэраў, выступаючых перад рабочымі і сялянамі з выкрыцьцем падрыхтоўкі новай сусьветнай бойні і нападу на СССР.

Там, дзе пануе II Інтэрнацыянал.

У Бэльгіі за зьмяшчэньне артыкулу проці падрыхтоўкі да вайны ў канцы чэрвеня 1929 году быў канфіскаваны орган кампартыі „Драпо Руж" („Чырвоны Штандар") і працягнуты да адказнасьці член ЦК бэльгійскай кампартыі дэ-Бэк і камуністычны дэпутат парляманту Жакмот.

У Нямеччыне камуніст Гунзэль быў засуджан 17-га лістапада 1927 году на год і 3 мес. турмы за распаўсюджаньне сярод салдат рэйхсвэру (нямецкай арміі) газэты „Салдат рэйхсвэра". Рэдактар камуністычнай газэты „Дэр Кемпфер" („Барацьбіт") у Хэмніцы быў прысуджан у сакавіку месяцы 1929 г. да турэмнага зьняволеньня за зьмяшчэньне адозвы ЦК кампартыі проці новай імпэрыялістычнай вайны. Адначасова да 9 мес. турмы быў прысуджаны рэдактар бэрлінскай „Ротэ Фанэ" („Чырвоны Штандар") тав. Штэйнікэ.

А Англіі, у Гамільтоне, у ліпені 1928 г. былі кінуты ў турму за распаўсюджаньне сярод салдат мясцовага гарнізону рэвалюцыйных брашур чатыры маладыя гарнякі—Джон Графэн, Джордж Ціздаль, Патрык Алан і Робэрт Крахэм.

У „дэмакратычных" краінах.

У Фінляндыі за арганізацыю „ваеннага камітэту" дзеля прапаганды сярод салдат у г. Або былі арыштаваны ў сакавіку 1929 году дрэвааапрацоўнікі Вільлё Лейне, Нікла Ванэ і Віктар Якабсон.

У Францыі за распаўсюджаньне рэвалюцыйных адозваў сярод салдат 16 драгунскага палку ў Сэн-Жармэн-ан Луа (ля Вэрсалю) камсамольцы Марсэль Гонэн і Люсьен Кэрамбур былі прысуджаны да 6 мес. турмы. У лістападзе 1928 году ў Валансьене, Анзэне, Дэнуэне былі арыштаваны 5 камсамольцаў за антымілітарыстычную прапаганду, у тым ліку сэкратар валансьенскай арганізацыі камсамолу Раймонд Шато. Андрэ Марці па васьмёх працэсах, зьвязаных з яго выступленьнямі проці падрыхтоўкі вайны на рабочых сходах і ў друку, атрымаў увогуле 5 гадоў і 10 мес. турмы і грашовых штрафаў у 15.000 франкаў (разам з падаткамі на штрафы, гэта складае 60.000 фр.). У сьнежні 1928 г. рэдактар „Юманітэ" Франсуа Гэй атрымаў 6 мес. турмы і 1.000 фр. штрафу за зьмяшчэньне антымілітарыстычных артыкулаў. Рэдактар салдацкай газэты „Конскры", камуністычны дэпутат гарадзкой думы ў Сэн-Дэні (прадмесьце Парыжу) Вільлём, 80-цігодовы камуніст Каро—рэдактар органу кампартыі ў Туры, супрацоўнік „Юманітэ" Габрыель Дэры—былі прысуджаны да турмы на розныя тэрміны ў сакавіку-чэрвені 1929 г. За зьмяшчэньне артыкулаў аб братаньні салдат з бастуючымі гарнякамі ў Комбе—камуністы Бутаньне, Лакан і Дэніс былі прысуджаны ў чэрвені 1929 г. да 11 год турмы. За распаўсюджаньне сярод салдат адозваў па прычыне агляду паветранага флёту ў Вэнсэне ў маі 1929 г. было арыштавана больш 40 чалавек, у тым ліку супрацоўнік „Юманітэ" Жані, актывіст-камсамолец Жакэ і інш.

У Швэйцарыі салдатам забаронена пад жахам ваеннага суду выпісваць орган кампартыі „Базлер Форвэртс" дзеля таго, што там зьмяшчаюцца допісы ваенкораў аб становішчы ў казармах. У Злучаных Штатах у студзені 1928 году было арыштавана шэраг камсамольцаў у Чарлестоўне за распаўсюджаньне адозваў проці інтэрвэнцыі ў Нікарагуа.

Зварачаюцца да правакацый.

Гэткія-ж факты штодзённа прыводзяцца рабочым друкам усяго сьвету. Некаторы час таму назад у „Юманітэ" быў апублікаваны таемны загад вайсковага міністэрства, які прапануе камандзірам часьцей дапускаць рабочыя дэлегацыі ў сярэдзіну казарм, затрымліваць іх там і выклікаць паліцыю для безадкладнай адпраўкі дэлегатаў у турму. Гэткім чынам вайсковыя часьці афіцыйна зварачаюцца ня толькі да тэрору, але і да правакацыі, для барацьбы з антымілітарыстычным рухам.

(Па матар'ялах Бюро Друку Выканкому Мопр).

ЛІТАРАТУРА ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЮ.

БРАШУРЫ.

Ф. Карыкаш—„Вайна па выбару". Апавяданьне з гісторыі сусьветнай вайны і барацьбы за Савецкую Вэнгрыю. Ц. 18 к.

Л. Вальнсні.—„Ад вайны да вайны". Папулярная брашура да 15-цігодзьдзя ўсясьветнай вайны і Міжнароднаму Чырвонаму дню, з прадмовай А. Барбэ, члена Выканкому Камінтэрну. Цана 15 к.

Г. Саргеў.—„Памятуй аб вайне". Брашура разьлічана на масавага чытача. Цана 8 кап.

Д. Утнес. — „Міжнародны Чырвоны Дзень". Мэтадычныя дырэктывы для ячэек Мопр. Цана 5 к.

МАСТАЦКІЯ ПЛЯКАТЫ.

Дэні.—„Міжнародны Чырвоны Дзень"—дзень мабілізацыі сусьветнага пралетарыяту проці імпэрыялістычных войн. Цана 15 кап.

Леткар.—„На зьмену паўшым падымуцца новыя тысячы барацьбітоў за пралетарскую рэвалюцыю". Цана 15 к.

Леткар. — „Рыхтуйце адпор растучай рэакцыі". Цана 20 к.

ПАДПІСКА НА 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

За адзін дзень падпісаліся на 5625 руб.

(№ ЧЫРВОНАШТАНДАРТНЫ ПОЛК).

У палку пачала разгортвацца падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. За адзін дзень падпісаліся 55 чал. на 5625 руб. Капэльмэйстар палка т. Лебедзеў С. Я. падпісаўся на 350 руб.; па 200 р. т. т. Вінціла, Дубкоў і Хоцін; па 150 т. т. Саладоўнікаў і Макараў. Чырвонаармеец хозроты падпісаўся на 15 р.

Чырвоная армія разам з працоўнымі будуе новую сацыялістычную гаспадарку.

Я. Л.

* * *

Рабочыя працакалектыву абутнікаў № 1 у працягу поўгадзіны ў часе абедзенага перапынку сабралі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 3060 руб. Наперадзе ідуць камсамолец Гардон, які, зарабляючы ў месяц 130 руб., падпісаўся на пазыку на 350 руб. і адзін рабочы шавец пры заработку ў 100 руб. падпісаўся на 300 руб.

* * *

Рабочыя заводу „Беларусь" ужо сабралі падпіску на новую пазыку на 4000 руб. Не забываюць рабочыя і аб захаваньні аблігацый 2 пазыкі: было набыта аблігацый на 6035 руб., а калектыўна здалі на хаваньне ў крэдытную ўстанову на 5710 р., што складае 95 проц. агульнай сумы.

* * *

Па ўчарашні дзень рабочыя і служачыя фабрыкі „Меншэвік" сабралі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 14000 р. Падпіска працягваецца.

* * *

Калектыў працаўнікоў ЦВК і СНК БССР ужо здаў у Дзяржбанк афармленай падпіскі на новую пазыку на 10000 р.

* * *

Навуковыя працаўнікі Беларускай Акадэміі Навук у адказ на выпады імпэрыялістаў сабралі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 14000 р. Падпіска ўжо афармлена ў Дзяржбанку. Калектыў працаўнікоў БАН спадзяецца, што пасьля сканчэньня кампаніі водпускаў сума падпіскі будзе падвоена.

* * *

Настаўнікі і інструктары Менскай абяднанай прафшколы за адзін дзень сабралі падпіску на пазыку індустрыялізацыі на 2000 р. Падпіска ўжо афармлена.

* * *

Калектыў працаўнікоў Беларускай канторы Дзяржбанку ўжо аформіў падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 11000 руб.

* * *

Працаўнікі апарату „Белбумтрэсту" сабралі падпіску на новую пазыку індустрыялізацыі на 8000 руб. Падпіска на пазыку ўжо афармлена.

* * *

Пры ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых адбыўся агульны сход працаўнікоў ЦП, які пастанавіў усім падпісацца на 150 проц. месячнага заработку і выклікаць працаўнікоў усіх ЦП саюзу і ЦСПСБ падпісацца ў такім-жа разьмеры.

* * *

Супрацоўнікі сельска-гаспадарчай каапэрацыі г. Менску ў ліку 115 чалавек сабралі падпіскі на пазыку на 19400 руб. Падпіска яшчэ працягваецца. Шмат працаўнікоў падпісалася больш як на месячны заработак.

* * *

Калектыў працаўнікоў беларускага аддзяленьня Дзяржвыдавецтва РСФСР сабраў папярэдняй падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 4675 руб.

Папярэдняя падпіска дала 100000 руб.

Па прадпрыемствах і ўстановах, якія прымацаваны да галоўнай касы зашчадкасьці, папярэдняя падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на няпоўных яшчэ вестках дала звыш 100000 р.

Да ўсебеларускага зьлёту піанэраў.

ДА ЎСІХ ПІАНЭРАЎ, ДА ЎСІХ ВУЧНЯЎ, ДА ЎСІХ ДЗЯЦЕЙ БССР.

Усебеларускі зьлёт піанэраў, які адбудзецца ў жніўні ў Менску, зьявіцца базавым абглядам грамадзкай працы піанэрскіх атрадаў і зьвеньняў, зьявіцца справаздачай піанэрскай арганізацыі аб тым, як дзеці рабочых і сялян дапамагаюць сацыялістычнаму будаўніцтву. Адным з галоўных мерапрыёмстваў, праз якое ўсебеларускі зьлёт піанэраў зможа паказаць усім працоўным працу і дасягненьні піанэрскай арганізацыі Беларусі, будзе Усебеларуская выстаўка „Дзеці Савецкай Беларусі". Зусім зразумела, што гэтая выстаўка ня зможа быць поўнай і адбіць усіх тых цікавых, жывых і канкрэтных спраў, праробленых дзецьмі Савецкай Беларусі, калі самі піанэры-вучні і дзеці не дапамогуць у арганізацыі яе, ня прымуць актыўнага ўдзелу ў яе абстаўленьні. Удзельнікам вялікае справаздачы піанэраў і дзяцей перад партыяй, савецкай уладаю і ўсімі працоўнымі можа і павінен быць кожны піанэр, кожны вучань, кожны падлетак.

Маладыя аграномы, юныя тэхнікі, натуралісты, мастакі, юныя сталяры, сьлесары, электра-тэхнікі, краўчыхі і вышывальніцы, да вас зьвяртаецца выставачны камітэт з тым, каб кожны з вас даслаў на ўсебеларускую выстаўку ўсё лепшае, што зроблена вашымі рукамі, тое, што зможа характарызаваць дзяцей Беларусі, як актыўных памоснікаў будаўніцтва сацыялізму. Дасылайце свае працы па сельскай гаспадарцы ў выглядзе мадэляў, сельска-гаспадарчых машын, плугоў, трактараў, сох, веялак і г. д., прылады кармушак, ацяплёных хлявоў, калекцый гатункоага насеньня, угнаеньня, шкодзікаў, пустазельля, яек, а таксама самастойна выраблены сельска-гаспадарчыя і гародныя расьліны ў сябе, у гаспадарцы, або на гародзе атраду, ці школы. Апісаньне і вынікі праробленых вопытаў па прарашчваньні і вырашчваньні насеньня і інш. У аддзел „праца і тэхніка ў піанэратрадзе" дасылайце розныя, зробленыя вамі, прыборы, прылады, а таксама мадэлі, схэмы, рысункі машын і прыладаў па гэткіх галінах, як радыё, электратэхніка, мэханіка, хімія, фото, авіё і інш. Акрамя гэтага, дасылайце розныя зробленыя вамі малюнкі, вышыўкі, розныя рэчы хатняга ўжываньня, зробленыя вамі інструманты і наогул усё тое лепшае, што ёсьць у вас, і над чым вы працуеце. Дасылайце таксама рэчы па клюбна-мастацкай працы, як: макеты тэатру свайго праздрыёмства, розныя музычныя зробленыя вамі інструманты, малюнкі, карціны, розныя лепкі. Вашы прапановы аб тым, як ляпей мастацкі аформіць карнавал, дэманстрацыю, фотаздымкі, самаробныя гульні, выдуманыя вамі фокусы, рэбусы і інш., вершы і апавяданьні на розныя тэмы.

Атрады юных піанэраў! Яшчэ ня позна стаць актыўнымі ўдзельнікамі ўсебеларускае выстаўкі, даць справаздачу аб сваёй працы. Дасылайце на ўсебеларускую выстаўку „Дзеці Савецкай Беларусі" матар'ялы аб вашай працы ў выгляде малюнкаў, дыяграм, мадэляў, фотаздымкаў, лістовак, калекцый, схэм і інш., а таксама работы вашых гурткоў, зьвеньняў, асобных піанэраў і неарганізаваных дзяцей. Лепшыя працы гурткоў, атрадаў, асобных піанэраў і дзяцей будуць адпраўлены на ўсесаюзную выстаўку, а таксама прэміраваны.

Усе вашы працы на ўсебеларускую выстаўку дасылайце да 10-га жніўня бясплатна (наложаным плацяжом) па адрасу: Менск, ЦК ЛКСМБ, Макарэвічу, прычым на цэтліку напішэце ваша прозьвішча, імя і імя па бацьку, узрост, атрад і ваш адрас.

Менскія піанэры і дзеці прыносяць свае работы ў Цэнтральны піанэр-габінэт (Дом камсамолу, Камсамольская вул., № 25, 2-гі паверх), акрамя аўторка і суботы штодзённа ад 6 да 9 гадзіны ўвечары, а пасьля 1-га жніўня ў памяшканьні 2-й школы ад 10 да 3-х гадзін дню.

Юныя піанэры і дзеці Беларусі! Чакаем вашае дапамогі ў абстаўленьні ўсебеларускай выстаўкі „Дзеці Савецкай Беларусі".

Цэнтральны Штаб Усебеларускага зьлёту піанэраў пры ЦК ЛКСМБ.

Прафэсыянальныя саюзы недастаткова падрыхтаваліся да піанэрскага зьлёту.

Загадчык культаддзелу ЦСПСБ тав. Клімковіч у гутарцы з нашым супрацоўнікам абмаляваў стан падрыхтоўкі прафсаюзаў да Усебеларускага піанэрскага зьлёту.

Саюз чыгуначнікаў даў указаньні сваім нізавым прафарганізацыям прыняць актыўны ўдзел у сустрэчы і провадах піанэраў.

Белбюро чыгуначнікаў адпусьціла менскаму ВУЧК 300 р. на арганізацыю сустрэчы піанэраў, якія прыяжджаюць на Усебеларускі зьлёт. Зараз у Менску сярод чыгуначнікаў ідзе праца па высьвятленьню, хто з рабочых і колькі зможа ўзяць да сябе на кватэру прыяжджаючых на зьлёт піанэраў.

Высьвятляюцца таксама патрэбы піанэрскіх арганізацый чыгуначнікаў для аказаньня ім матар'яльнай дапамогі.

Саюз працаўнікаў асьветы ўсё яшчэ не раскачаўся. Толькі ўчора пастаўлена пытаньне на прэзыдуме ЦП аб канкрэтным удзеле менскіх асьветнікаў у абслугоўваньні піанэрскага зьлёту.

Праўда, дырэктывы аб падрыхтоўцы да піанэрскага зьлёту дадзены яшчэ 15 ліпеня, але самі працаўнікі ЦП саюзу не спадзяюцца, што іх дырэктывы выкананы, бо ў гарадох амаль нікога не засталася (адпускная кампанія).

22 ліпеня пры ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва адбылася нарада прадстаўнікоў менскіх мясцкомаў, якая распрацавала плян абслугоўваньня піанэрскага зьлёту.

Намечана разам з саюзам будаўнікоў наладзіць два вечары для азнаямленьня членаў саюзу з піанэрскім рухам. Адпушчаны сродкі на набыцьцё дзіцячай літаратуры. ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва пастанавіла павялічыць водпуск сродкаў на піанэрскую працу.

Зараз усе цэнтральныя праўленьні саюзаў узяліся за праверку дырэктыў, якія імі былі дадзены сваім акруговым і нізавым прафарганізацыям у справе падрыхтоўкі да піанэрскага зьлёту.

Пры культаддзеле ЦСПСБ гэтымі днямі была праведзена нарада прадстаўнікоў фабмясцкомаў 16 больш буйных прадпрыёмстваў Менску. На нарадзе высьветлілася, што на большасьці фабрык і заводаў ужо праведзена падрыхтоўчая праца: былі праведзены агульныя сходы рабочых, а таксама жонак рабочых. Шмат рабочых дабрахвотна прапанавалі ўзяць да сябе на кватэру прыяжджаючых на зьлёт піанэраў.

Гэта нарада пастанавіла шырока азнаёміць рабочых з працай сваіх піанэрскіх арганізацый і аказаць апошнім матар'яльную дапамогу. На шырокіх рабочых сходах будуць абгаварвацца даклады піанэрарганізацый пры прадпрыёмстве.

На ўсіх гэтых прадпрыёмствах абраны з рабочых тройкі, якім даручана правесьці ўсю падрыхтоўчую працу да піанэрскага зьлёту. Тройкі павінны будуць зрабіць справаздачу перад рабочымі аб праробленай працы.

У заключэньне ўсё-ж трэба сказаць, што падрыхтоўка прафсаюзаў да піанэрскага зьлёту праходзіць яшчэ слабым тэмпам. Мала яшчэ зроблена практычнага для правядзеньня зьлёту. Застаючыся да зьлёту час трэба поўнасьцю скарыстаць для ажыцьцяўленьня падрыхтоўчай працы.

У КАМІТЭЦЕ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ПІАНЭРЗЬЛЁТУ ПРЫ ЦВК БССР

На паседжаньні камітэту з удзелам ЦСПСБ, НКА, НКАЗ і інш абгаварвалася справа практычнае дапамогі піанэрам ў часе зьлёту.

З інфармацый пералічаных устаноў відаць, што праца па падрыхтоўцы да зьлёту ідзе хуткім тэмпам. МЦРК абавязаўся даць лепшае харчаваньне ў часе зьлёту, не падвышаючы кошту абеду і сьняданьняў. НКА зробіць справаздачу піанэрскаму зьлету аб сваёй дзейнасьці за апошні год.

Загадчык культаддзелу ЦСПСБ паведаміў, што рабочыя буйнейшых менскіх фабрык і заводаў выказалі жаданьне ўзяць да сябе на кватэру прыяжджаючых піанэраў. Асабліва вялікую ініцыятыву ў гэтай справе выяўляюць самі менскія піанэры, якія на заводзе „Камунар" у абедзенны час правялі з бацькамі-рабочымі мітынг, у выніку чаго за адзін дзень 60 рабочых ахвотна згадзіліся ўзяць да сябе ў часе зьлёту вясковых піанэраў. Аналёгічныя мітынгі праводзяцца і на іншых заводах.

Цэнтральны штаб піанэрскага зьлёту зьвярнуўся да менскай радыё-станцыі з просьбай трансляваць галоўныя моманты зьлёту. З гэткаю просьбаю штаб зьвярнуўся і да маскоўскае радыё-станцыі.

Галоўмастацтва ўзяло на сябе абавязаньне культурнага абслугоўваньня піанэраў; Беларускінкіно абавязалася зазьняць галоўныя моманты зьлёту і прадэманстраваць гэты здымак перад піанэрамі.

СТАНОВІШЧА Ў ПОЛЬШЧЫ.

Унутранае становішча Польшчы характарызуецца зараз нясупынным павялічэньнем эканамічнага крызісу і сур'ёзнымі палітычнымі перашкодамі фашызму. Часовая добрая эканамічная кан'юнктура, якая трымалася з паловы 1926 году, у 1928 годзе скончылася. Шалёныя выдаткі на армію, якія забіраюць каля паловы ўсяго дзяржаўнага бюджэту, эканамічная палітыка польстага фашызму, які імкнецца прыстасаваць усю народную гаспадарку да падрыхтоўкі будучай вайны проці СССР, з аднага боку, абяднеьне шырокіх працоўных мас Польшчы і звужэньне ўнутранага рынку—з другога, прывялі краіну да эканамічнага крызісу.

Пра пачатак эканамічнага крызісу перш-на-перш сьведчыць заняпад апрацоўваючай прамысловасьці. У буйнай тэкстыльнай прамысловасьці Лодзі, водлуг даных прамыслоўцаў, блізка 60 проц. усіх рабочых працуе толькі на тры дні на тыдзень, толькі 15 пр. працуе поўны тыдзень. У іншых цэнтрах тэкстыльнае прамысловасьці Польшчы становішча нічым ня лепшае. Яшчэ горш справа ў сярэдняй і дробнай прамысловасьці з колькасьцю рабочых ад 10 да 300 чалавек на адно прадпрыёмства. Там рабочы дзень скарочан да 3—1 дню на тыдзень; не адна тысяча рабочых выкінута на вуліцу.

Адчуваецца застой у будаўнічай прамысловасьці.

Заняпад вытворчасьці заўважаецца таксама ў каменавугольнай і мэталёвай прамысловасьці. Дзённая прадукцыя каменнага вугалю зьнізілася ў лютым у параўнаньні са студзенем на 7 проц.; тое-ж самае і ў мэталюргічнай прамысловасьці Верхняй Сілезіі. **Толькі прамысловасьць, якая працуе на вайну, ідзе поўным ходам і нават пашыраецца, павялічваецца колькасьць рабочых гадзін.**

Агульная колькасьць беспрацоўных у прамысловасьці, згодна афіцыйных даных, павялічылася ад лістапада да сакавіка з 78 тысяч да 184 тысяч. Праўда, у пачатку летняга сэзону колькасьць беспрацоўных пачала крыху зьнізацца і да канца мая складала 128 тысяч, але гэта толькі часовае, сэзоннае палепшаньне.

Курс прамысловых акцый зьнізіўся з 107,3 і 114,3 у студзені і красавіку 1928 г. да 95,7 і 92,1 у студзені і лютым 1929 г.

Найбольшай вастраты дасягнуў грашовы крызіс.

Процант апратэставаных вэксалёў павялічыўся з 2,47 у лістападзе 1928 г. да 5,12 у сакавіку 1929 г.; у парыяд вялікага крызісу ў лютым 1926 году ён складаў 4,91. Грашовы голад дасягнуў такіх разьмераў, што прыватны вучотны процант дайшоў да 3,5 у месяц або 42 проц. гадавых (у канцы 1928 г. і 20 проц.). Аднак, курс польскага злота пакуль што ўдалося затрымаць на ранейшым узроўні, хоць з вялікімі цяжкасьцямі, тым больш, што пасыў гандлёвага балянсу, які дасягнуў летась 854 мілёнаў злотых, з кожным месяцам павялічваецца (у сьнежні ён складаў 29 млн. злотых, у студзені—52 млн., у лютым —97 млн., у красавіку—107 млн.).

Усе польскія пазыкі на чужаземных біржах зьніжаюцца ў сваім курсе. Новых замежных пазык, у зьвязку з выяўленымі гаспадарчымі цяжкасьцямі ў Польшчы да гэтага часу не ўдалося атрымаць; але калі яны і будуць атрыманы, дык гэта яшчэ больш закабаліць Польшчу чужаземнаму капіталу і толькі часова здолее некалькі паслабіць вастрату крызісу, бо галоўныя прычыны, якія выклікалі яго, застануцца ня зьнішчанымі. Спадзявацца на пашырэньне замежных рынкаў для польскай прамысловасьці не даводзіцца; наадварот, танныя нямецкія фабрыкаты заваявалі месца польскіх тавараў нават у тых мясцох, куды ім удалося прайсьці.

Усё гэта, з р а з у м е л а, не гаворыць яшчэ аб катастрафічным становішчы польскай гаспадаркі, а толькі аб некаторых цяжкасьцях, аб пачатку сур'ёзнага крызісу, які перажываецца ў выніку зьніжэньня набывальнай здольнасьці сельска-гаспадарчых працоўных мас, гарадзкіх рабочых і дробнай буржуазеі, і шалёных ваенных падрыхтовак проці СССР.

У зьвязку з эканамічным крызісам, які, бясумоўна, сьведчыць аб нятрываласьці і загніваньні капіталістычнай стабілізацыі ў Польшчы, наглядаюцца і вельмі сур'ёзныя, усё ўзрастаючыя палітычныя цяжкасьці фашызму, якія перарастаюць у крызіс. Выхад з гэтага становішча ён спрабуе знайсьці ў стварэньні так званага палкоўніцкага ўраду з ранейшых палкоўнік

ЗАГАДЗЯ ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Бабруйшчына рыхтуецца.

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

Асеньняя сяўба на Бабруйшчыне пройдзе пад той агульнай устаноўкай барацьбы за лепшы ўраджай, пад якой праходзіла і веснавая сяўба. Для таго, каб атрымаць магчыма большыя вынікі на барацьбе за лепшы ўраджай мяркуецца ў час асеньняй сяўбы правесьці наступныя мерапрыёмствы. Будзе павялічана пасеўная плошча азімага кліну супроць леташняга на 4711 гэктар, што дае павялічэньне на 2,2 проц. Зернаачышчэньне будзе распачата своечасова з тым, каб магчыма было ачысьціць да 60 проц. насеннага матар'ялу. Апрача таго вялікая ўвага будзе аддадзена пратручваньню насеньня азімае пшаніцы. Кярэцца лінія на тое, каб ніводнага фунта насеньня пшаніцы ня было ўкінута ў зямлю непратручаным.

У справе палепшаньня ўраджаю нашых палёў вялікую ролю адыгрывае якасьць насеньня. У сучасны момант акруговы цэнтр занят турботаю аб стварэньні насеннага фонду. Для гэтае мэты будзе праведен пасеў гатунковым насеньнем на плошчы ў 2500 гэктараў. Амаль што палова гэтае плошчы будзе засеяна пшаніцаю і другая палова жытам.

Сёлета шырока будзе практыкавацца таксама абмен сялянскага звычайнага насеньня ў савгасах і калгасах на гатунковае. Абмен насеньня па папярэдніх меркаваньнях прадугледжваецца ў колькасьці да 12 тысяч пудоў.

У агульнай сыстэме мерапрыёмстваў па ўздыму ўраджайнасьці ўгнаеньне глебы на Бабруйшчыне стаіць адным з важных мерапрыёмстваў асеньняй пасяўной кампаніі. Апрача завозу вялікай колькасьці рознага мінэральнага ўгнаеньня, у сёлетнюю восень на сялянскіх палёх будзе закладзена 70 паказацельных вучасткаў з тарфяным угнаеньнем. Гэта будзе мерапрыёмствам па папулярызацыі тарфянага ўгнаеньня. Будзе шырока разгорнута работа на арганізацыі тарфяных таварыстваў з ухілам скарыстаньня торфу на ўгнаеньне. Будзе практыкавацца закладка кампостных куч. Будзе праведзена вапнаваньне глебы на плошчы ў 4175 гэктараў. На вапнаваньне глебы будзе скарыстана да 150 тысяч р. крэдытных сродкаў.

Сельска-гаспадарчымі машынамі акруга да пасеву будзе забясьпечана ў дастатковай колькасьці. Частка іх ёсьць ужо на складах, а частку мяркуецца завезьці.

На лініі калгасаў у час асеньняга пасеву мяркуецца прарабіць наступную работу. Будзе арганізавана 20 новых калгасаў. Значная доля з гэтых калгасаў будзе арганізавана з яўрэйскага насельніцтва. Пасяўны азімы клін у калгасах у асеньнюю пасяўную кампанію будзе павялічан на 4 проц. за кошт незанятых зямель.

Калгасы ставяць перад сабою задачу правесьці пасеў радковымі селькамі на 30 процантаў ад агульнае плошчы пасеву.

У час асеньняй сяўбы калгасы Бабруйшчыны бяруць на сябе абавязак абслугоўваць вакольнае сялянства сваімі сельска-гаспадарчымі машынамі, даць вёсцы свае зернаачысьціцельныя машыны і, апрача таго, аказаць працоўную дапамогу ў часе пасеву ня менш як 300 бядняцкім гаспадаркам.

На правядзеньне асеньняга пасеву для калгасу патрэбна да 120 тысяч р. крэдытаў.

Значная доля крэдытаў разьмяркована сярод крэдытных таварыстваў і вясковага сялянства.

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё забясьпечыць плянавае, арганізаванае правядзеньне асеньняе сяўбы на Бабруйшчыне і дасьць магчымасьць пазбавіцца ад тых памылак, якія наглядаліся ў час правядзеньня веснавое сяўбы.

Правядзеньне асеньняга пасеву таксама будзе залежыць і ад таго, як арганізавана і своечасова на акрузе будзе праведзена ўборка ўраджаю і якая дапамога будзе аказана ў гэтым вясковай беднаце.

А. Дамброўскі.

ПЕРШЫ СНОП—НА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ КРАІНЫ.

(Жлобінскі р-н, Бабр. акр.)

Пленум Казіміраўскага с-с., заслухаўшы прапанову сельскора С. аб здачы першага снопа ў карысьць дзяржавы на індустрыялізацыю краіны, пастанавіў здаць першы снап. Сяляне, прысутнічаючыя на пленуме, таксама згадзіліся з гэтай прапановай, кажучы, што снап у гаспадарцы ролі вялікай на грае, а калі па снапу з кожнага ды ў места, дык створыцца вялікая колькасьць, якая хоць не на вялікі крок, але падыме індустрыю.

Гэта гаворыць аб тым, што сялянства разумее сэнс узмацненьня прамысловасьці, а таму і са свайго боку ідзе на сустрэч дзяржаве.

Справа гэта вельмі добрая, а таму неабходна, каб усе сяляне зрабілі па гэтаму прыкладу, і гэта было-б самым найлепшым падарункам дзяржаве ад надыходзячага жніва.

П. Слупскі.

ДЗЬВЕ ВЁСКІ—У АДЗІН КАЛГАС.

(Рагачэўскі р.).

Імкненьне сялянства ў калгасы з кожным днём расьце, асабліва бядняцка-серадняцкая частка насельніцтва зразумела карысьць буйнай гаспадаркі—калгасаў. Вось чаму сяляне вёскі Гарадзея і Сямінаўкі аднагалосна ўхвалілі арганізаваць адзін калгас. Ужо запісалася 150 гаспадарак, далей запіс працягваецца.

Вёскі прыслалі дэлегацыю ў райвыканком аб аказаньні дапамогі ў арганізацыі калгасу. На месца тэрмінова выехалі прадстаўнікі РВК для зацьверджаньня статуту калгасу. Калгас будзе займаць плошчу каля 2000 дзесяцін зямлі. Так шырыцца калектывізацыя ў Рагачоўшчыне.

Я. Крушына.

Падрыхтоўка пачалася добра.

(Аршаншчына).

Усім райёнам дадзена заданьне, каб яны ў сваю чаргу далі заданьне кожнаму сельсавету і кожнай вёсцы, як у адносінах зернаачышчэньня, так і ў адносінах правядзеньня таго ці іншага мерапрыемства па пашырэньню пасеўнай плошчы, падвышэньню ўраджайнасьці і г. д. Сельсаветы павінны будуць добра наладзіць спаборніцтва як паміж сабою, так і паміж асобнымі вёскамі. Гэта абавязковая задача ўсім райёнам і сельсаветам.

У сваю чаргу, кожны савгас, калгас і зернаачысьцільны абоз павінен мець задачу і таксама праводзіць спаборніцтва на большае абслугоўваньне насельніцтва і на большую колькасьць ачысткі насеньня.

Мяркуецца пратравіць па акрузе 875 тон зімовай пшаніцы ад галаўні. Будзе заложана 45 дэманстратыўна-паказальных вучасткаў і 150 па запраўцы глебы штучным угнаеньнем, торфам і вапнаю, а таксама і дасьледчых вучасткаў—70. Палепшаньне папару будзе зроблена на плошчы 38713 га альбо на 27 проц. папарнай плошчы па акрузе, радковы пасеў на плошчы —651 га ў савгасах, 692 га ў калгасах і 940 га ў індывідуальных гаспадарках і пад зяблевую ўспашку будзе адводзіцца 50 проц. зімовага кліну—гэта заданьне кожнай гаспадарцы акругі, што складзе плошчу ў 84559 га. На шматпольле будзе пераведзена плошча ў 25200 га. Кантрактацыю зімовых мяркуецца правесьці на плошчы 3000 га.

Для правядзеньня ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы патрэбна будзе завезьці ў акругу: плугоў—1000 шт., сеялак радавых—20 штук, льнотрапалак—15, льнотрашчотак—18, барон пружыновых—300 штук, барон зігзаг—150 шт., малатарак—365, веялак—500, саламарэзак—595, льномалак—397, сартыровак—50 і трактароў—10 штук. На ўсё гэта патрабуецца крэдытаў 271310 руб., з якіх 116000 руб. на крэдытаваньне насельніцтва. Заяўкі на машыны ўжо дадзены Белсельсаюзу.

Штучнага ўгнаеньня для асеньняй сяўбы патрэбна: фасфарыту—2000 тон супэрфасфату—447 тон, касьцяной мукі—2000 тон, азоцістых угнаеньняў—82 тоны і калійнай солі—164 тоны. Усё гэта павінна быць завезена ў акругу ў хуткім часе.

Замена звычайнага насаньня палепшаным і сартавым будзе зроблена: жыта на плошчы—1340 га, віка—на плошчы 118 га, пшаніца на плошчы 130 га. На гэта ўжо асыгнавана—29150 руб. крэдытаў.

Апрача ўсяго гэтага будзе зроблена замена сахі плугам у 1344 гаспадарках, на што ўжо адпушчаны сродкі-крэдыты ў суме 14694 р., стварэньне свайго акруговага насеннага фонду яравых, зімовых і траў, арганізавана 32 новыя калгасы і скончана арганізацыя намечаных вытворчых сельска-гаспадарчых каапэратываў, заложана новых 540 садоў, новых пладовых насаджэньняў, пашырэньне пладовых прамысловых выхавальнікаў і арганізацыя садова-гародных баз, барацьба са шкоднікамі і хваробамі садоў і гародаў і г. д. Па ўсё гэта ёсьць ужо таксама крэдыты.

Такім чынам, акруга пачала шпарка рыхтавацца да асеньняй сяўбы. Заяўкі на ўсё патрэбнае ўжо дасланы ў цэнтр, тое, што патрэбна зрабіць сваімі сродкамі і сіламі—будзе зроблена. Прыходзіцца толькі трывожыцца за своечасовасьць завозу ўсяго патрэбнага ў акругу і за поўны завоз. Але будзем спадзявацца, што так як было вясной, што з многіх запатрабаваньняў акругі былі задаволены зусім нямногія і то ня поўнасьцю, цяпер ужо ня будзе.

А. Калюжны.

Праца яшчэ не разгорнута.

(Прапойскі р., Магілеўскай акр.).

Падрыхтоўчая работа да асеньняй кампаніі распачата 1-VII г. г. Гэта работа праводзіцца ў напрамку ажыцьцяўленьня заключанай умовы па сацыялістычнаму спаборніцтву і ажыцьцяўленьня пастаноў вышэйстаячых органаў. Канкрэтна распрацаваным плянам правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі ва ўмовах райёну прадугледжана правесьці наступныя работы: арганізаваць 3 буйныя калектыўныя гаспадаркі: адзін у вёсцы Хрыстафораўка, другі—яўрэйскі калгас у м-ку Прапойску і 3-ці калгас перасяленцаў; узбуйніць 3 калгасы ўноў арганізаваныя ў м. Прапойску, Новай Слабадзе, Хрыстафораўцы за лік вакольных вёсак, якія ў сучасны момант маюць цягу да гэтых калгасаў. Арганізаваць у напрамку каапэраваньня індывідуальныя бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у простыя віды аб'яднаньняў, як і пасяляковае таварыства, 2 машынныя, 3 мэліарацыйных, 1 насеннаводнае таварыства. У напрамку пашырэньня пасеўнага азімага кліну супроць мінулагодняй кампаніі 1928 году прадугледжана пашырыць за лік распашак на 5 проц., г. ё. з 8269 гэктараў 1928 году да 8351,6 гэктара—1929 году, альбо на 72 гэктары; такім чынам азімы клін будзе мець засеву ад агульнай пахаці 31,4 проц.

На шляху падвышэньня ўраджайнасьці, як у калгасных, так і індывідуальна бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарках намечана правесьці наступныя галіны работ, пашырыць шматпалёвы севазварот у калгасах ўноў арганізаваных на 300 гэктараў, адначасова праверыць у напрамку замацаваньня шматпалёвага севазвароту ранёй праведзеных 8 калгасаў, праверыць у 14 пасёлках замацаваньне шматпольля і сяльскі праэкты пераводу на шматпольле ўноў земляўпарадкаваных 20 пасёлкаў. У асеньнюю пасеўкампанію намечана ачысьціць насеньня на 15 зернаачысьціцельных машынах у райёне і 2 калгасных 982,3 тоны, што складае да агульнага высеву 65,3 проц., засеяць радковым севам у індывідуальных гаспадарках на плошчы 30 гэктараў і ў калектыўных гаспадарках на плошчы 200 гэктараў выключна гатунковым насеньнем, за лік загатоўкі апошняга ў калгасах.

Крэдытнымі таварыствамі намечана нарыхтаваць насеннага матар'ялу для здавальненьня бядняцкіх гаспадарак райёну і адначасова зрабіць абмен насеньня звычайнага на гатунковае ў 3-х калгасах. Гатунковае насеньне пойдзе выключна ўноў арганізаваным калектыўным гаспадаркам. Гатунковае насеньне мяркуецца выдаць выключна пад кантрактацыю, што ў гэту асеньняю кампанію будзе закантрактавана, як у калгасах, так і ў індывідуальных гаспадарках на плошчы 180 гэктараў, 3 крэдытнымі таварыствамі.

Адным з галоўнейшых работ, як новы мэтад ва ўмовах райёну, уводзіцца вапнаваньне глебы, якой у гэту восеньскую пасеўкампанію намечана заваппаваць 150 гэктараў у калектыўных гаспадарках і 198 гэктараў у пасялковых таварыствах. Гэта мерапрыёмства заняло нямала часу. Па гутарках з сялянствам, якімі прынята пастанова на сходах, але-ж гэта мерапрыёмства патрабуе большай увагі з боку РВК і крэдытнай каапэрацыі:—хутчэйшай пабудове намечаных 2-х вапнавых млынаў, хоць апошнія да гэтага часу належна сваю работу не распачалі, што можа здарыцца затрымка ажыцьцяўленьня шляху вапнаваньня глебы за адсутнасьцю матар'ялу, хаця адзін вапнавальны млын (да яго пабудовы толькі прыступлена) падрыхтаваў патрэбны матар'ял, а другі няведома з якога часу пачне будавацца, у якога да гэтага часу ня знойдзена месца і непадрыхтован матар'ял. Гэтым пытаньнем неабходна зацікавіцца, узяць больш рашучы напрамак да хутчэйшай пабудовы.

Што-ж ужо зроблена РВК па шляху практычнага правядзеньня ў жыцьцё намечанага пляну? Прапрацован на папыраным пленуме РВК, праведзена нарада старшынь сельсаветаў, старшынь КСУ, аграўпаўнаважаных з прадстаўнікамі ад калгасных гаспадарак. Праведзена 13 куставых сходаў аграўпаўнаважаных, арганізаваны 2 машынныя т-вы з лікам 27 гаспадарак, падрыхтаваны 2 калгасы. Трэба лічыць, што гэта работа знашла свой адбітак у працаўнікоў. Што-ж датычыцца падрыхтоўчай работы па лініі РКСУ, то справа абстаіць дрэнна, належнай разгорнутай работы не адчуваецца. Гэтак сама няма належнага адбітку дапамогі ў правядзеньні васеньняй кампаніі з боку прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Шчакалаў.

Сёлета рыхтуемся лепш.

(Падгайскі с.-с., Самахв. райёну).

Калі ўзяць за прыклад мінулую асеньнюю пасеўкампанію, дык трэба адзначыць, што яна прайшла ў надзвычайна цяжкіх умовах. Пара сяўбы надышла, а жыта сялянскае яшчэ на полі, а калі ўзяць нашыя савгасы, дык там за атсутнасьцю працоўных рук пры 8 гадз. дні ўборка яшчэ горш зацягнулася. Атрымаць у абмен ад савгасаў гатунковага насеньня, альбо ачысьціць сваё, нечага было і думаць. Сельсавет і камітэт дапамогі ў гэтым напрамку нічога не рабілі. Аднак сялянства рыхтавалася да гэтай сяўбы. Шляхам абаюднага абмену простага жыта на гатунковае, пяткускае усё-ж такі большасьць сялянства нашага с-с. засеялі гатунковым насеньнем, езьдзячы часамі для абмену за 10-ць вёрст. Глеба для сяўбы была заранё падрыхтавана і сеў закончыўся своечасова.

Для пашырэньня пасеўнага кліну, с-с. ўжо выяўлена некалькі заняпалых гаспадарак, у якіх взяла гадамі ляжала аблогам і служыла толькі пашаю для скаціны. Цяпер мяркуе палі гэтых гаспадарак засеяць камітэт дапамогі, або аддаць пад пасеў беднякам. Складаецца плян ачысткі насеньня ў абавязковым парадку для кожнага паселішча. Робяцца захады да выяўленьня, колькі, дзе і якога можна будзе атрымаць штучнага ўгнаеньня. Праводзіцца шырокая кампанія па кантрактацыі азімых.

Савгасы рыхтуюць машыны для ачысткі насеньня. Сяляне з свайго боку рыхтуюцца яшчэ лепш. Усе вольныя кавалкі пару засеяны лубінам. Спасаныя і скошаныя канюшыны зараз-жа заворваюцца, каб да сяўбы яшчэ раз пераараць. Дзеля эканоміі насеньня рыхтуюцца сеяць сеялкай. Плошча пасеву азімых павялічваецца кожны год за лік яравых.

Усе гэтыя падрыхтоўкі сьведчаць аб тым, што асеньняя пасеўкампанія пройдзе добра.

М. Русаловіч.

Што дае сацыялістычнае спаборніцтва ў прамысловасьці.

У прамляне ВСНГБ абгаворан даклад аб выніках работы прамысловасьці за чэрвень і за 9 месяцаў бягучага гаспадарчага году.

У мінулым годзе чэрвень месяц звычайна даваў рэзкае скарачэньне вытворчасьці, сёлета-ж зусім іншы малюнак, у 1927 годзе вытворчасьць прамысловасьці ў чэрвені была скарочана на 12 проц., у 1928 г.—на 14 проц., а сёлета ўсяго толькі на 2,7 процантаў.

Рашаючы ўплыў на скарачэньне вытворчасьці ў чэрвені бягучага году мелі шкляная, швэйная, запалкавая і панчошна-трыкатажная прамысловасьці, у якіх распачалася аднуская кампанія. Павялічыўся ў чэрвені выпуск прадукцыі па мэталёапрацоўваючай прамысловасьці—на 5,2 проц., скуранай—на 8 проц., дрэваапрацоўчай—на 14,7 проц. і ў папяровай прамысловасьці—на 6,2 проц.

У параўнаньні з тым-жа месяцам мінулага году выпуск прадукцыі павялічыўся на 50,7 проц., што можна лічыць вялікім дасягненьнем.

Нельга не адзначыць і таго факту, што калі за 8 месяцаў бягучага году выпуск валавай прадукцыі па сучасных цэнах павялічыўся на 33,8 проц. дык за 9 месяцаў выпуск прадукцыі ўзрос ужо на 35 проц.

Па асобных кварталах процант выкананьня прамысловасьцю вытворчых праграм малюецца наступнымі лічбамі: —у 1 кварт. плян выканана на 89,2 проц., у 2—на 85,3 проц. і ў 3 квартале ўжо на 99,9 проц. Такім чынам, дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву, у апошнія месяцы мы маем заметнае палепшаньне ў рабоце рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ Беларусі.

У выніку сацыялістычнага спаборніцтва за чэрвень месяц вытворчасьць працы павялічылася на 5,4 проц., паменшыўся і процант прагулаў з 0,7 да 0,5 проц. У галіне прагулаў даюць выключэньне толькі панчошна-трыкатажная фабрыка і „Палесдрук", якія далі рост прагулаў: першая—з 0,2 да 0,8 проц. і другая—з 0,20 да 0,39 проц.

Зварачваюць на сябе ўвагу па некаторых прадпрыёмствах выпадкі парушэньня працоўнай дысцыпліны: на фабр. „Дзьвіна" у чэрвені было 21 выпадак, на фабр. „Карла Маркса"—32 і на заводзе «Домбаль»—86 выпадкаў, з якіх 42 прыпадае на сьпячку ў часе работы.

Такім чынам, хоць у параўнаньні з папярэднімі месяцамі мы маем палепшаньне працоўнай дысцыпліны, усё-ж, як і раней, гэтае пытаньне павінна быць у цэнтры ўвагі гаспадарнікаў і прафарганізацый.

Слабая ўвага зварачваецца на пытаньне барацьбы з пякучасьцю рабочай сілы. Органы Наркампрацы невыўчаюць гэтага пытаньня, каб зьнішчыць ненармальнасьць.

У галіне зьніжэньня сабекошту прадукцыі III квартал даў такія вынікі: напяровая прамысловасьць, у параўнаньні з леташнім годам, зьнізіла сабекошт на 10 проц. за апошні квартал—супроць 4,4 проц. за паўгодзьдзе; па скураной прамысловасьці за 9 месяцаў зьніжэньне дасягнула 3,3 проц., у мэталёапрацоўчай—на 5 проц. Усё-ж трэба канстатаваць, што дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту ўсёй прамысловасьці ў цэлым застаюцца невыкананнямі. Такім чым IV квартал у пытаньні сабекошту зьяўляецца рашаючым. Неабходна мабілізаваць увесь вытворчы апарат прамысловасьці, каб дырэктывы выканаць поўнасьцю.

У заключэньне неабходна сказаць што фінансавыя цяжкасьці служаць перашкодай у рабоце прамысловасьці. Фінансавыя цяжкасьці ў значнай меры тлумачацца скарачэньнем кароткатэрміновага крэдыту, што ставіць у цяжкае становішча шэраг галін прамысловасьці, але разам з тым трэба зазначыць, што пытаньням мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў адводзіцца недастаткова ўвагі.

Вынікі абсьледваньня шэрагу прадпрыёмстваў сьведчаць аб тым, што наша прамысловасьць яшчэ недастаткова мабілізавала свае ўнутраныя рэсурсы, гэта пытаньне застаецца актуальным і на бліжэйшыя месяцы.

ПРАЦУ КААПЭРАЦЫІ—ПАД АБСТРЭЛ МАС.

Даволі быць толькі гандлярамі.

(Дудзіцкае спаж. т-ва на Мазыршчыне).

Аб культурна-асьветнай працы наша Дудзіцкае спаж. т-ва, мабыць, цалкам забыла. Зьнішчэньне няпісьменнасьці, падняцьце ўраджайнасьці, веснавая пасеўкампанія і цэлы шэраг іншых прац на сяле прайшлі і праходзяць бяз жаднага ўдзелу каапэрацыі. Калі яшчэ ўзімку некаторыя лікпункты зьвярнуліся за дапамогай у Дудзіцкае т-ва, то атрымалі адказ:—Мы гроші плацім РВК і няхай ён вам дае.—Можа і неабавязана каапэрацыя дапамагаць непайнікам, але няпісьменным пайнікам трэба дапамагчы.

У час перавыбараў праўленьня пайнікі вымагалі культурнай працы сярод іх, гаварылі за адчыненьне каапэратыўных куткоў пры хатах -чытальнях і чырвоных куткох, за выпіску пэрыядычнай каапэратыўнай літаратуры, за арганізацыю лекцый і басед і ўсё гэта абяцала праўленьне выканаць, але вось ужо прайшло чатыры месяцы і яшчэ нічога ня зроблена.

Крамнікі, амаль што ўсе, партыйцы і камсамольцы, але таксама глядзяць і назіраюць на праўленьне.

Зараз пачынаецца падрыхтоўка да асеньняй сяўбы і хоць гэта праца і больш датычыць сальска-гаспадарчай каапэрацыі, але і спажывецкая таксама павінна раскачацца і папрацаваць, а Дудзіцкая асабліва, бо да гэтага часу яна адыхала.

Даволі быць толькі голымі гандлярамі, трэба быць і добрымі грамадзкімі працаўнікамі. Гэтага патрабуюць пайнікі.

Вас. Дубовы.

ДАРОГУ ЖАНЧЫНЕ!

(ДУБРОВЕНСКАЕ СПАЖЫВЕЦКАЕ Т-ВА).

Справа з высоўваньнем жанчын на адказную працу ў Дубровенскім спажывецкім таварыстве, трэба заўважыць, абстаіць кепска. За цэлы шэраг гадоў існаваньня таварыства ніводная жанчына ня высунута, ня гледзячы на тое, што жанчыны і скардзяцца. На сягоньнешні дзень таварыства ня мае на адказнай працы ніводнай жанчыны. Я бачу, што віна тут мясцкома, які не вядзе ніякай працы сярод жанчын, на што патрэбна зьвярнуць увагу.

Зоркае вока.

„Трэба пацікавіцца".

Магілеўскае таварыства „Чырвоны Ратай" сёлета адпусьціла 150 руб. і Лупалаўскае сельска-гаспадарчае Крэдытнае таварыства—50 руб. з свайго фонду на ўтварэньне дзіцячых пляцовак.

За гэтыя сродкі ўтворана пляцоўка ў вёсцы Фойна, Лупалаўскага райёну, якую наведвае 25 дзяцей выключна беднякоў.

Здаецца, што зроблена добрая справа, але калі заглянуць у гэту пляцоўку і пацікавіцца яе працай, дык трэба адзначыць, што гэта не пляцоўка, а проста сабрана кучка дзетвары, якія нічым не адрозьніваюцца ад тых, якія знаходзяцца на вуліцы ў вёсцы Фойна, бо гэта пляцоўка не дае малюнку ўзорнага выхаваньня дзяцей, так як дзеці знаходзяцца ў сваёй хатняй вопратцы, няма пацак, а яшчэ, горш, што дзеці іншы раз бываюць ня сёньня на цэлых днёх. Пляцоўка ўжо працуе цэлы месяц, але яе працай ніхто ня цікавіцца і нават забылі аб яе існаваньні. Ніхто ня хоча заглянуць сваім гаспадарчым вокам ні жанаддзел, ні Лупалаўская райінспэктура, якія ўтварылі гэтую пляцоўку, а тым больш—не заглянулі у гэту пляцоўку і каапэрацыйныя ўстановы, якія адпусьцілі сродкі.

Акрамя гэтага, пляцоўка мае ганаровага шэфа РАСМАСДОР, які, я баюся не памылюся, ня ведае нават і месца знаходжаньня яе.

Мы маем усяго адпушчаных сродкаў на гэту пляцоўку дзьвюма каапэрацыйнымі арганізацыямі—200 руб., з якіх на утрыманьне загадчыцы пляцоўкі трэба выдаткаваць у месяц па 48 руб. Такім чынам, на адно толькі харчаваньне не хапае, ня кажучы ўжо аб пацках, вопратцы і інш. выдатках, а калі падлічыць усё гэта, то патрабуецца на пляцоўку тэрмінам на тры месяцы каля 350 р.

Будзем спадзявацца, што гэтай справай у далейшым зацікавяцца, каго гэта датычыцца, і праца пляцоўкі будзе пастаўлена на належную вышыню: пляцоўка зьявіцца ўзорным паказчыкам у вачох насельніцтва, як трэба выхоўваць новае пакаленьне.

Праежджы.

Скурсындыкат „рэгулюе" рынак.

„Давай и яго лягну"... успомніў скурсындыкат байку Крылова і разаслаў па сваёй лініі цыркуляр прыблізна наступнага зьместу:

„Дзяржгандальбел ня мае ніякага права весьці загатоўку жарабкоў (шкуркі жарабят) праз перакупнікаў, а дзеля гэтага, таварышы, пільна сачыце за «чырвонымі купцамі», адбярыце ў іх, перакупнікоў, усе запасныя скуркі, складайце акты і арудуйце ва ўсю".

І на скураным рынку пачалася фармальная вакханалія: скуркі жарабят, як экспартны тавар, замест Дзяржгандальбелу нападаў скурсындыкату, агенты апошняга ўчынілі фармальную блёкаду, не прапускалі ніводнага перакупніка з скурамі.

Між тым, сэзон загатовак жарабкоў у поўным распале. Дзяржгандальбел мае цьвёрдае заданьне па выпаўненьню экспартнага пляну ў траўні і чэрвені.

— Што там планы, што заданьні мы не дазволім дзяржгандлярам рабіць незаконныя дзеяньні, разважаў загадчык скурсындыкату т. Бурштэйн (падпісаўшы гэты выдатны цыркуляр.) Калі Наркамгандаль не наглядае за тым, дык мы можам і без Наркамгандлю справіцца з ім... Не вялікія паны, гэтыя дзяржгандляры, хай чытаюць пастановы, няхай не ўтвараюць замятажу на рынку.

Эх, таварышы з скурсындыкату, мы вам успомнім яшчэ адну байку Крылова: „Беда, коль пироги начнет печи сапожник" і г. д., кепска, калі скурсындыкат бярэцца за рэгуляваньне рынку, калі ён на сябе бярэ функцыі Наркамгандлю, бо калі скурсындыкат сапраўды хацеў-бы прынесьці карысьць дзяржаве, калі-б скурсындыкат хацеў-бы скасаваць ажыятаж і канкурэнцыю, дык ён-бы ўважліва прачытаў палажэньне аб перакупніках, дзе чорным па беламу падкрэсьліваецца: «Дзяржгандальбел мае права праз разьязных асоб, перакупнікаў, весьці загатоўку жарабкоў бесперашкодна".

І для ведама скуртрэсту паведамляем, што Наркамгандаль, роля якога на вялікі жаль, перайшла да скурсындыкату, сваім цыркулярам ад 21-V г. г. пацьвярджае магчымасьць загатоўкі праз перакупнікаў.

Можна быць добрым шаўцом, але вельмі кепскім пекарам. Скурсындыкат, магчыма, добрая ўстанова, але ўзяць на сябе рэгулюючыя функцыі—для гэтага ён яшчэ малады, не дарос, гэткімі няўмелымі і адважнымі цыркулярамі Скурсындыкат прыносіць значную шкоду экспарту, уносіць хаос і блытаніну на рынку сыравіны, на якім яшчэ да гэтага часу дзяржаўныя арганізацыі паміж сабой ваююць вядуць самую хваравітую канкурэнцыю.

Перакупнікаў Дзяржгандльбелу хватаюць усе, хто хоча: члены праўленьня спажывецкае каапэрацыі, члены сельсавету, міліцыянэры, а таксама і перакупнікі, якія сочаць «чужых перакупнікаў», адбіраюць у іх дакумэнты...

Дык чаму скурсыдыкату ў сваёй справе не пацешыцца, і пад шумок, пакуль „суд да справа", зьняць некалькі сот штук жарабковых скур...

„И я его лягну".

Л. Манін.

Пра экспартную сыравіну забылі.

(Слуцкі райён).

Ніжэй паданыя даныя аб выкананьні гадавога заданьня па нарыхтоўках паказваюць, што гадавы плян пры такім тэмпе нарыхтовак можа быць нявыкананы:

Аддзяленьне дзяржгандлю за 1-е паўгодзьдзе выпаўніла гадавога заданьня на 37 проц. са значным хістаньнем па асобных відах сыравіны да 50 проц.

Спажывецкая каапэрацыя за гэты тэрмін выпаўніла 45,1 проц. яшчэ з большымі хістаньнямі па асобных відах ад 8,6 да 6,8 проц.

Пералічым аснаўныя віды сыравіны, як-та: косьці, капыты, анучы і г. д. тут мы маем яшчэ горшае становішча. Удзел прыватніка па скупцы халішчавіны і ануч надзвычайна вялікі.

У Слуцку прыватнікі маюць вялікія склады па адсартаваньню і перасушцы ануч.

Прыватнік спэцыяльна разьязджае па вёсках з падводай і шляхам абмену на іголкі пясьму, шылы, запалкі шпількі вытварае нарыхтоўку тых самых ануч, аб якіх нашы каапэратары мала думаюць.

Побач з нарыхтоўкай ануч той-жа прыватнік скупляе конскі волас, шчаціньне і іншае, часта ня маючы на гэта права, але „анучы ўсе прыкрываюць". Яму сходзіць пры благасхільных адносінах нашых органаў на мясцох.

Закон аб рэгістрацыі прыватных гандляроў пакуль што застаецца на паперы, прыватнік прыкрывае гэтыя пастановы анучамі, выкарыстоўвае нашу вядбайнасьць.

Наш каапэратыўны актыў, які налічваецца сотнямі чалавек не выкарыстоўваецца на гэтым важным вучастку працы. Каапэратыўныя арганізацыі ня ўцягваюць яго ў практычную працу. Самі чакаюць пакуль селянін прынясе; прыватнік-жедзе пад вакно сам і скупляе тое, што пры добрым стане работы павінна была-б закупаць каапэрацыя.

Уся наша грамадзкая праца сярод сялянства ў справе нарыхтовак экспартнае сыравіны, асабліва другараднае, прападае дарэмна з тае прычыны, што мы грамадзкую думку не падмацоўваем арганізацыйна-практычнымі захадамі.

Гэтая наша хвароба шмат чаго нам каштуе. Аб гэтым асабліва павінны падумаць нашы каапэратары—зрабіць з гэтага належны вывад.

У справе выпаўненьня плянаў экспартных нарыхтовак неабходна зараз-жа ўжыць шэраг практычных захадаў як па лініі грамадзкае працы, таксама і па лініі практычных мерапрыёмстваў загатоўчых арганізацый.

Да практычных мерапрыемстваў мы адносілі: Уцягваньне каапэрацыйнага актыву ў працу прэміраваньня здатчыкаў экспартнае сыравіны, спыніць „разбазграваньне" гэтых тавараў на непрызначэньню, арганізаваць чырвоныя загатоўчыя павозкі, прыняць захады да абмежаваньня згодна закону безкантрольныя нарыхтоўкі прыватніка.

Неабходна дабіваца, што пэрсанальная адказнасьць работнікаў за справу нарыхтовак экспартнага сыр'я павінна быць яшчэ раз падкрэслена.

Рашучая барацьба з безадказнасьцю і абы якімі адносінамі.

Я. Курганскі.

Культурна-асьветная праца сярод беларускага насельніцтва Заходняй вобласьці РСФСР.

Заходняя вобласьць РСФСР, арганізаваная ў бягучым годзе, аб'ядная ўсе усходнія часткі беларускага этнаграфічнага прастору, раней разарванага межамі некалькіх губэрняў. З гэтай прычыны, для культурна-асьветнай працы сярод беларускага насельніцтва зрабіліся новыя абставіны, якія патрабуюць пільнае ўвагі савецкай грамадзкасьці.

Ня гледзячы на тое, што галоўныя асаблівасьці беларускае мовы, а таксама і быту наглядаюцца амаль-што на ўсім абшары Заходняй вобласьці, ўсесаюзны перапіс 1926 году налічыў тут па шэсьць мільёнаў агульнага насельніцтва толькі 78.153 чал. беларусаў (пераважна ў Велікалуцкай, Смаленскай, Клінцоўскай і Рослаўскай акругах).

Сярод іншых нацыянальных меншасьцяй вобласьці беларусы складаюць 21,5 проц., а між усяго насельніцтва—трохі больш аднаго процанту.

Гэткае становішча тлумачыцца даволі проста. Дамо слова мясцовым працаўнікам.

„В частности, перепись в Смоленской губернии обнаружила неосведомленность многих местных работников о местах, где живут белоруссы, что порождало много недоразумений".

„В пограничных с Советской Белоруссией районах отдельные советские работники из интеллигенции особенно во время переписи высказывались публично в том смысле, что причисление населения данного пункта к белорусской национальности может затруднить его обслуживание медицинской и вообще культурной помощью". (А. Розин. „Просвещение нац. меньшинств". Народное просвещение № 8-9 за 1927 год).

«... Опрашиваемый спотыкался на вопрос о народности.

— Пишите меня к Украине. Если я запишусь русским, то меня выселят в Брянскую губернию, а сюда пришлют хохлов. Я слышал, что переписывают для того, чтобы выселять.

Иные пишутся «хохлами», чтобы не выслали в другую губернию, другие—потому, что ждут возможности переселиться на черноземные земли Украины.

— Хоть язык на Украине и не по душе, ну, да нас насильно учить не заставят, пишите—украинец».

(„Переписчик" Стародубского уезда Брянск. губ. Учительская Газета № 5 за 29-I—1927 г.).

Трэба заўважыць, што ў горадзе—абласным цэнтры беларуская мова наўмысьля ігнаруецца. Напрыклад, у сьвята шасьцёхгодзьдзя Канстытуцыі СССР у гарадзкім міжсаюзным садзе Смаленску кідаўся ў вочы вялізны плякат з пралетарскім лёзунгам на расейскай, польскай, нямецкай і яўрэйскай мовах. Беларускае ня было, хоць у горадзе жыве 2.333 беларусы пры 1.773 паляках.

Пры гэткіх умовах дзіўна яшчэ, як гэта каля 80.000 жыхароў вобласьці прызналі сябе за беларусаў.

Блытаніна з вызначэньнем беларускага насельніцтва ў Зах. вобласьці дайшла да таго, што абласны інспэктар нацмен запытаў Наркамасьветы РСФСР аб прысылцы асобай камісіі з навуковых спэцыялістых, якая-б сумесна з смаленскімі этнографамі дакладна высьветліла пытаньне аб усходніх межах расьсяленьня беларусаў.

У сучасны момант на чатырох акругах Заходняй вобласьці маецца 67 беларускіх школ I ступені і 4 школы павышанага тыпу, з якіх адна—Рудзянская дзевяцігодка—з пэдагагічным ухілам.

Па асобных адміністрацыйных адзінках беларускія асьветныя ўстановы разьмяркоўваюцца наступным чынам:

Вялікалуцкая акруга—школ I ступ. 25, хат-чытальняў—8,

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра мерапрыёмствы для ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны.

Для выкананьня пастановы СНК СССР „Пра мерапрыёмствы для ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны" (З. З. СССР 1929 г., № 19, арт. 167), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі:

а) распрацаваць разам з Народным Камісарыятам Працы і ЦСПСБ на працягу месяца канкрэтныя мерапрыёмствы, якія дапамаглі-б далейшаму разьвіцьцю справы сацыялістычнага спаборніцтва і зьнішчылі-б выяўленую ў паасобных мясцох бюракратычнасьць у практыцы правядзеньня гэтага спаборніцтва, а таксама арганізаваць падлік дасягненьняў у практыцы сацыялістычнага спаборніцтва для далейшага скарыстаньня іх у прамысловасьці;

б) скараціць да мінімуму перагляд і зьмены прамысловых плянаў у пэрыяд іх выкананьня і ўстанавіць строгі кантроль за выкананьнем прадпрыёмствамі плянавых заданьняў;

в) устанавіць разам з Народным Камісарыятам Працы парадак пераразмеркаваньня рабочай сілы паміж прадпрыёмствамі, калі плянамі працы на прадпрыёмствах выяўлен недахоп рабочай сілы на адных прадпрыёмствах і лішкі яе на другіх;

г) узмацніць унутры прадпрыёмстваў перамяшчэньне з ніжэйшай работы на вышэйшую рабочых, у першую чаргу больш дысцыплінаваных і доўга працуючых на прадпрыёмствах, праводзячы для гэтага падрыхтоўку іх на курсах для падвышэньня кваліфікацыі і перанавучаньня.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы:

а) распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы для ўстанаўленьня адказнасьці бірж працы за якасьць рабочых і служачых, якія пасылаюцца імі, і для забясьпечаньня строгіх мер барацьбы з беспрацоўнымі, якія ўпарта ўхіляюцца ад працы, а таксама канкрэтны парадак пасылкі біржамі працы на работы звольненых за парушэньне працоўнай дысцыпліны;

б) пашырыць разам з Народным Камісарыятам Аховы Здароўя, ВСНГ і ЦСПСБ сьпіс прафэсій, для работнікаў якіх патрэбен перад залічэньнем іх на работу мэдычны абгляд;

в) устанавіць разам з ВСНГ і ЦСПСБ парадак пераводу адміністрацыяй дзяржаўных прадпрыёмстваў на іншую сталую працу рабочых і служачых, якія з прычыны паніжанай працаздольнасьці ня могуць належным чынам выконваць сваёй звычайнай працы;

г) не пазьней, як праз 2 месяцы падаць у СНК праэкт пастановы аб такім парадку аплаты прастояў, які-б заахвочваў рабочых да зьмяншэньня ліку прастояў;

д) ужыць належныя захады да налепшаньня работы бірж працы ў справе забясьпечаньня прамысловасьці рабочаю сілаю патрэбнай кваліфікацыі і для змаганьня з бягучасьцю рабочай сілы;

е) правесьці разам з Народным Камісарыятам Аховы Здароўя ў бліжэйшы час шырокую праверку работы дактароў, якія абслугоўваюць застрахаваных; вывучыць прычыны захворваньня ў паасобных галінах прамысловасьці і ўжыць захады для зьмяншэньня гэтых прычын, ужыць канкрэтныя захады для змаганьня з сымуляцыяй і ўзмацніць дактарскі кантроль страхавых органаў; адбор рабочых і служачых для пасылкі ў санаторыі і дамы адпачынку рабіць у нерабочы для іх час.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя:

а) увесьці прыёмы хворых ва ўстановах амбуляторнага тыпу ў штотыднёвыя дні адпачынку;

б) прыстасаваць гадзіны запісу рабочых і служачых да дактароў да зьмен на прадпрыёмствах.

4. Даручыць Балкаапсаюзу і Народнаму Камісарыяту Гандлю правесьці канкрэтныя мерапрыёмствы для лепшага абслугоўваньня каапэрацыяй рабочых і служачых у нерабочы час.

5. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам прыстасаваць трамвайны і аўтабусны рух да пачатку і заканчэньня рабочых зьмен на прамысловых прадпрыёмствах.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

22 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

аб абавязковым акладным страхаваньні ў гарадох у 1929-30 бюджэтным годзе.

На падставе пастановы Савету Працы і Абароны ад 28 чэрвеня 1929 г. („Изв. ЦВК СССР" за 5-VII 1929 г. № 151) Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць на 1929-30 бюджэтны год у гарадох: Бабруйску, Барысаве, Быхаве—Старым, Ветцы, Віцебску, Гомелі, Горках, Гарадку, Добрушы, Дуброўне, Жлобіне, Калінкавічах, Клімавічах, Лепелю, Менску, Магілеве, Мазыры, Мсьціслаўлю, Воршы, Петрыкаве, Полацку, Рэчыцы, Рагачове, Сянно, Слуцку, Чавусах, Чэрвені, Чэрыкаве і Шклове наступныя віды абавязковага акладнога страхаваньня: будынкаў ад агню, с-г. пасеваў, садоў і гародаў ад градабіцьця, рагатага быдла і коняй ад падзяжу. Апрача таго, у гарадох Аршанскай, Бабруйскай, Віцебскай, Магілеўскай і Менскай округ устанавіць страхаваньне с-г. пасеваў ад вымачак і вымаразак дадаткова да страхаваньня іх ад градабіцьця.

2. Акладныя нормы (страхавыя сумы) у гарадох па страхаваньню будынкаў ад агню ўстанавіць у разьмеры 75 проц. ад ацэнкі будынкаў, з тым аднак, каб гэтыя нормы ня былі ніжэй 200 руб. для жыльлёвых будынкаў і 50 руб. для няжыльлёвых.

У выпадку, калі ацэнка будынкаў будзе ніжэй паказаных мінімальных норм (200 руб. для жыльлёвых і 50 руб. для няжыльлёвых будынкаў), то страхавыя сумы вызначаюцца ў разьмеры поўнай страхавой ацэнкі.

3. Тарыф прэміі па страхаваньню будынкаў ад агню (страхавы плацеж) устанаўляецца ў разьмеры 10 кап. са 100 руб. страхавой сумы для гор. Менску, 20 кап. для гарадоў Бабруйску, Барысаву, Віцебску, Воршы, Гомелю, Добрушу, Магілеву, Полацку і 30 к. для рэшты гарадоў. Гэты тарыф устанаўляецца для ўсіх будынкаў незалежна ад матар'ялу сьцен і стрэх.

Увага. Будынкі, якія спэцыяльна прыстасаваны для прамысловых прадпрыемстваў, з ацэнкай іх ад 500 руб. і вышэй, у тым выпадку калі гэтыя прадпрыемствы знаходзяцца ў руху,—тарыфіцируюцца па павышаных стаўках: замест 10 кап.—15 к.; замест 20 к.—30 к.; замест 30 к.—45 кап.

4. Страхавы ўзрост для рагатай жывёлы і коняй устанавіць ад 2 з палов. гадоў і старэй для ўсіх гарадоў БССР.

5. Акладныя нормы (страхавыя сумы) устанавіць:

а) для рагатай жывёлы ў разьмеры 20 руб. за галаву;

б) для коняй ва ўзросьце да 16 гадоў уключна—30 руб. за галаву. Для коняй ва ўзросьце звыш 16 гадоў і старэй акладныя нормы ўстанаўляюцца ў палавінным разьмеры (15 руб.).

6. Тарыф прэміі (страхавы плацеж) устанаўляецца для ўсіх округ па страхаваньню рагатай жывёлы 4 проц. (4 р. са 100 р. страхавой сумы), альбо 80 кап. за галаву і па страхаваньню коняй—6,3 пр., (6 р. 30 к. са 100 р. страхавой сумы), альбо 1 р. 89 к. за галаву для коняй ва ўзросьце да 16 гадоў уключна і 95 кап. для коняй ва ўзросьце звыш 16 гадоў і старэй.

7. Акладныя нормы (страхавыя сумы) для палявых пасеваў ва ўсіх округах устанавіць у 22 руб. на дзесяціну.

Для садоў і гародаў устанаўляюцца акладныя нормы: для садоў—140 руб. дзесяціна і для гародаў—180 руб.

Акладныя нормы (страхавыя сумы) для палявых пасеваў, якія належаць калгасам, устанаўляюцца ў разьмеры 50 руб. на дзесяціну.

8. Тарыф прэміі (страхавы плацеж) устанаўляецца:

а) па страхаваньню ад градабіцьця ў Гомельскай, Мазырскай і Полацкай округах—1,5 проц. (1 р. 50 к. са 100 руб. страхавой сумы);

б) па страхаваньню ад градабіцьця з дадатковай адказнасьцю ад вымачак і вымаразак у Аршанскай, Бабруйскай, Віцебскай, Магілеўскай і Менскай округах—4,5 проц. (4 р. 50 кап. са 100 руб. страхавой сумы);

в) па страхаваньню садоў ад градабіцьця—2,5 проц. (2 р. 50 к. са 100 руб. страхавой сумы) і па страхаваньню гародаў ад градабіцьця—2 проц. (2 р. са 100 руб. страхавой сумы).

9. Для ўзносу страхавых плацяжоў вызначыць два тэрміны, якімі лічацца два апошнія тэрміны аплаты с-г. падатку, вызначаныя абавязковымі пастановамі акруговых выканаўчых камітэтаў па раёнах і сельскіх саветах.

10. Да першага тэрміну (другі па с-г. падатку) павінна быць унесена ня менш палавіны акладу, а да другога тэрміну (апошні па с-г. падатку)—рэшта плацяжоў.

11. Нясплачаныя ў паказаныя тэрміны сумы акладу спаганяюцца ў прымусовым (бясспрэчным) парадку, з налічэньнем пені ў разьмеры 0,2 проц. за кожны прапушчаны дзень.

Па сканчэньні бюджэтнага году далейшае налічэньне пені спыняецца.

12. Недоімка 1928-29 году з налічанай на яе па 30 верасьня 1929 г. пеняй спаганяецца прымусова незалежна ад тэрмінаў аплаты акладу 1929-30 году.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомнарады БССР **В. Крывіцкі.**

22 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Нар. Камісараў БССР

аб абавязковым акладным страхаваньні ў сельскіх мясцовасьцях у 1929-30 бюджэтным г.

На падставе пастановы Савету Працы і Абароны ад 28 чэрвеня 1929 г. („Известия ЦВК СССР" за 7-VII—1929 г. № 1531), Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць на 1929-30 бюджэтны год у сельскіх мясцовасьцях і ў мястэчках БССР наступныя віды абавязковага акладнога страхаваньня: будынкаў ад агню с-г. пасеваў, садоў і гародаў ад градабіцьця, рагатага быдла і коняй ад падзяжу на ўсіх округах. Апрача таго, у Аршанскай, Бабруйскай, Віцебскай, Магілеўскай і Менскай округах устанавіць страхаваньне с-г. пасеваў ад вымачак і вымаразак дадаткова да страхаваньня іх ад градабіцьця.

2. Акладныя нормы (страхавыя сумы) страхавога забесьпячэньня будынкаў устанавіць у наступных разьмерах:

Пры агульнай страхавой ацэнцы двара:
да 300 рублёў у разьмеры 80 проц. ацэнкі,
ад 301 да 600 р. у разьмеры 70 проц. ацэнкі, але ня ніжэй 240 руб.,
ад 601 да 1000 р. у разьмеры 60 проц. ацэнкі, але ня ніжэй 420 руб.,
ад 1001 і вышэй у разьмеры 50 проц. ацэнкі, але ня ніжэй 600 руб. і ня звыш 3000 руб.

Будынкі, якія належаць калгасам і зьяўляюцца аграмаджанай маемасьцю, страхуюцца ў 75 проц. ад страхавой ацэнкі.

Увага 1. У тых выпадках, калі ў дварох агульнай каштоўнасьці да 300 руб., прыстасаваньне далявой нормы ў 80 проц. магло бы паменшыць дзейнічаючыя ў 1928-29 годзе будыначныя нормы,—застаюцца ў моцы апошнія, пры ўмове, што яны не павінны перавышаць страхавой ацэнкі.

Увага 2. У выпадках, калі на працягу году здарыцца зьмена ў складзе будынкаў двара, а таксама ў выпадках павялічэньня ці памяншэньня ацэнак існуючых будынкаў двара,—акладное забесьпячэньне вызначаецца ў тэй-жа долі, якая была прыстасавана да гэтага двара з пачатку году.

3. Тарыф прэміі (страхавы плацеж) па страхаваньню будынкаў ад агню ўстанаўляецца ў разьмеры 0,75 проц. (75 кап. са 100 руб. страхавой сумы).

Увага. Для будынкаў, якія прыстасаваны спэцыяльна для прамысловых прадпрыёмстваў, з ацэнкай іх ад 500 руб. і вышэй, у тым выпадку, калі гэтыя прадпрыёмствы знаходзяцца ў руху,—устанавіць тарыф 1 р. 10 к. са 100 руб. страхавой сумы.

4. Страхавы ўзрост для рагатай жывёлы і коняй устанавіць ад 2 з пал. гадоў і старэй для ўсіх округ.

5. Акладныя нормы (страхавыя сумы) устанавіць:

а) для рагатай жывёлы ў разьмеры 20 руб. за галаву.

б) для коняй ва ўзросьце да 16 гадоў уключна—30 руб. за галаву. Для коняй ва ўзросьце звыш 16 гадоў і старэй акладныя нормы ўстанаўляюцца ў палавінным разьмеры (15 руб.).

6. Тарыф прэміі (страхавы плацеж) устанаўляецца для ўсіх округ па страхаваньню рагатай жывёлы 4 проц. (4 р. са 100 р. страхавой сумы), альбо 80 кап. за галаву і па страхаваньню коняй—6,3 пр., (6 р. 30 к. са 100 р. страхавой сумы), альбо 1 р. 89 к. за галаву для коняй ва ўзросьце да 16 гадоў уключна і 95 кап. для коняй ва ўзросьце звыш 16 гадоў і старэй.

7. Акладныя нормы (страхавыя сумы) для палявых пасеваў ва ўсіх округах устанавіць у 22 руб. на дзесяціну.

Для садоў і гародаў устанаўляюцца акладныя нормы: для садоў—140 руб. дзесяціна і для гародаў—180 руб.

Акладныя нормы (страхавыя сумы) для палявых пасеваў, якія належаць калгасам, устанаўляюцца ў разьмеры 50 руб. на дзесяціну.

8. Тарыф прэміі (страхавы плацеж) устанаўляецца:

а) па страхаваньню ад градабіцьця ў Гомельскай, Мазырскай і Полацкай округах—1,5 проц. (1 р. 50 к. са 100 руб. страхавой сумы);

б) па страхаваньню ад градабіцьця з дадатковай адказнасьцю ад вымачак і вымаразак у Аршанскай, Бабруйскай, Віцебскай, Магілеўскай і Менскай округах—4,5 проц. (4 р. 50 кап. са 100 руб. страхавой сумы);

в) па страхаваньню садоў ад градабіцьця—2,5 проц. (2 р. 50 к. са 100 руб. страхавой сумы) і па страхаваньню гародаў ад градабіцьця—2 проц. (2 р. са 100 руб. страхавой сумы).

9. Для ўзносу страхавых плацяжоў вызначыць два тэрміны, якімі лічацца два апошнія тэрміны аплаты с-г. падатку, вызначаныя абавязковымі пастановамі акруговых выканаўчых камітэтаў па раёнах і сельскіх саветах.

10. Да першага тэрміну (другі па с-г. падатку) павінна быць унесена ня менш палавіны акладу, а да другога тэрміну (апошні па с-г. падатку)—рэшта плацяжоў.

11. Нясплачаныя ў паказаныя тэрміны сумы акладу спаганяюцца ў прымусовым (бясспрэчным) парадку, з налічэньнем пені ў разьмеры 0,2 проц. за кожны прапушчаны дзень.

Па сканчэньні бюджэтнага году далейшае налічэньне пені спыняецца.

12. Недоімка 1928-29 году з налічанай на яе па 30 верасьня 1929 г. пеняй спаганяецца прымусова незалежна ад тэрмінаў аплаты акладу 1929-30 году.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомнарады БССР **В. Крывіцкі.**

22 ліпеня 1929 г.,
г. Менск.

ПРЫВІТАНЬНЕ СТУДЭНТАМ-ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМ!

(ДА ЗВАРОТУ З ВАЙСКОВЫХ ЛЯГЕРАЎ СТУДЭНТАЎ БДУ).

Сёньня варочаюцца ў горад пасьля шасьцітыднёвага прабываньня ў вайсковых лягерах студэнты БДУ. Перад імі стаяла нялёгкая задача—у працягу гэтага кароткага тэрміну зрабіцца зусім падрыхтаванымі байцамі-абаронцамі нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны і ўсё-ж свае абавязкі студэнты з гонарам выканалі: **вайсковае камандаваньне расцэньвае вынікі тактычнай, стралковай, хімічнай вучобы студэнтаў-чырвонаармейцаў, як зусім здавальняючыя.** Што датычыцца страявой выпраўкі, сьпеваў, то студэнцкія часьці ў лягерах проста ставіліся ў прыклад стараслужачым чырвонаармейцам.

Студэнты—будучыя камандзіры запасу—аднесьліся да сваіх абавязкаў ва ўсіх адносінах сьвядома. Дысцыпліна была на вышыні, колькасьць ускладзеных на студэнтаў спагнаньняў вельмі малая: агульны лік за ўвесь час не дасягнуў і дзесятка. І гэта тлумачыцца ні ў якім разе не лагоднымі адносінамі камандаваньня да студэнтаў-чырвонаармейцаў; у студэнцкіх часьцях падтрымлівалася тая-ж моцная дысцыпліна, якая наогул існуе ў нашай Чырвонай Арміі. Тут галоўную ролю адыгралі менавіта сумленныя адносіны саміх студэнтаў да ўсіх распараджэньняў камандаваньня. Сувязь паміж камскладам і студэнтамі-чырвонаармейцамі была добрая, але студэнты заўсёды адрозьнівалі, дзе канчаецца таварыш і пачынаецца камандзір.

Скаргаў па цяжкасьці вайсковай службы ня было. Адзіныя выпадкі ныцьця—«дескаць, больно уж сурова дисциплина»—самі-ж студэнты адразу дружна прыпынілі, ахрысьціўшы ныцікаў «маменькиными сынками»...

Каля 60 проц. студэнтаў-чырвонаармейцаў, што адбылі лягерны збор,—партыйцы і камсамольцы. Партячэйка разам з камсамольскай групай садзейнічаньня партыі зрабіла ўсё магчымае, каб дапамагчы вайсковаму камандаваньню ўзмацніць баяздольнасьць студэнцкіх часьцей. З аграмадным посьпехам прайшло сярод чырвонаармейцаў сацыялістычнае спаборніцтва: пасьля кожнай стральбы студэнты з рэдкай гарачнасьцю абгаварвалі свае посьпехі, перамогі і г. д. У сярэднім, студэнтамі дасягнута больш 60 проц. поўнага выкананьня стралкавых заданьняў.

Але мала таго, што студэнты-чырвонаармейцы здабылі вайсковыя веды. Яны паказалі сябе ў лягерах таксама добрымі працаўнікамі грамадзкасьці. Больш паловы студэнтаў вялі культурна-асьветную працу ў ротах. Многім дзесяткам чырвонаармейцаў-кадравікоў студэнты за час свайго прабываньня на лягерным зборы дапамагалі навучыцца чытаць і пісаць, уразумець пастановы XVI партканфэрэнцыі і г. д.

Большасьць студэнтаў у лягерах фізычна ўзмацнілася. Антрапамэтрычныя вымеры, зробленыя спачатку і ў канцы лягернага збору, паказалі, што амаль ва ўсіх студэнтаў узмоцнена мускулатура, пашырылася „грудная клетка", прыбавілася вага.

Зьвяртаючыся з лягераў у муры унівэрсытэту, студэнты абяцалі працягваць сваю справу ваенізацыі пралетарскага студэнцтва і рабоча-сялянскай моладзі. Яны заявілі:

— Калі партыя і савецкая ўлада заклічуць нас да абароны Савецкага Саюзу, мы ўсе, як адзін, гатовы зьмяніць кнігу на вінтоўку і зноў стаць у шэрагі нашай адважнай Чырвонай арміі.

Эм.

ХРОНІКА.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ.

Народны Каміс. Гандлю даў дырэктыву аб падрыхтоўцы да хлебазагатоўчай кампаніі, згодна якой да 1-га студзеня 1930 году павінен быць выкананы гадавы плян загатоўкі на 75 проц. Дзеля правядзеньня пасьпяховае падрыхтоўкі НКГ прапануе адпаведным арганізацыям правесьці шырокую растлумачальную працу на мясцох: у вёсках, калгасах, савгасах і індывідуальных гаспадарках.

Практыка мінулых гадоў паказала, што паасобныя хлебазагатоўчыя арганізацыі, закупляючы збожжа, дапушчалі паміж сабой канкурэнцыю, у выніку чаго селянін ня ведаў, куды весьці, ці ў Белсельсаюз, ці ў „Саюзхлеб", ці ў інш. арганізацыю.

Сёлета асноўнымі загатоўцамі хлеба застаюцца Саюзхлеб, БКС і БСС, цэнтральныя і райённыя органы спажывецкай сельска-гаспадарчай каапэрацыі не павінны мець сваіх загатоўчых апаратаў і ня маюць права купляць збожжа.

90.800 руб. на мерапрыёмствы па ахове працы.

У наступным годзе на прадпрыёмствах Белхарчтрэсту на мерапрыёмствы па ахове працы мяркуецца затраціць 90800 руб. У параўнаньні з бягучым годам гэта лічба выдаткаў дае павялічэньне амаль у 2 разы; павялічэньне выдаткаў на ахову працы мае сувязь з пераходам некаторых прадпрыемстваў на 7-хгадзінны рабочы дзень.

Экскурсіі асьветнікаў.

ЦП саюзу працаўнікоў асьветы правяло шэраг экскурсій асьветнікаў на Днепрабуд, у Маскву, Ленінград, па Каўказе і ў іншыя месцы Саюзу. У экскурсіі прыняло ўдзел каля 100 чалавек менскіх асьветнікаў.

Фабрыка „Меншвэй" расьце.

На факрыку „Меншвэй" врынята яшчэ 109 новых рабочых, якія пакуль што працуюць у старым памяшканьні.

Канчатковы пераход у новае фабрычнае памяшканьне адбудзецца ў жніўні.

200 асьветнікаў—на курорты.

У працягу летняй кампаніі саюз працасьветы накіраваў на курорты 200 асьветнікаў, галоўным чынам, вясковых настаўнікаў.

Апрача таго, толькі па Меншчыне будзе за летні час накіравана ў дамы адпачынку 320 асьветнікаў.

Напярэдадні новага вучэбнага году.

Да 25 ліпеня ў БДУ пададзена 336 заяў, з іх 103 на мэдфак, 141—на пэдфак, 66—на хімфак і 26 на правгас.

У Менскі палітэхнікум пададзена ўжо 529 заяў, з іх 183 ад рабочых.

Конкурс на п'есы для тэатру і клюбаў працягнут да 1 верасьня.

Наркамасьветы БССР пастанавіў працягнуць да 1 верасьня конкурс на п'есы для дзяржаўных тэатраў, клюбаў і вясковых сцэн.

Падрыхтоўка да міжнароднага Чырвонага дню.

У клюбе Карла Маркса адбылася нарада актыву Мопр'у скліканая А. К. Мопру і ЦСПСБ. На нарадзе прысутнічала каля 600 чалавек, галоўным чынам, рабочых менскіх фабрык і заводаў.

Цэнтрам працы нарады была падрыхтоўка да карнавалу Мопр'у, прысьвечанага Міжнароднаму Чырвонаму Дню.

Нарада вылучыла 15 чалавек для практычнага кіраўніцтва карнавалам, які адбудзецца ў нядзелю, 28 ліпеня.

Капітальнае абсталяваньне для фабрык і заводаў.

Дзяржгандаль БССР выпісаў поўнае капітальнае абсталяваньне для Гомельскай фабрыкі сельска-гаспадарчых машын. Частка машын ужо атрымана. Фабрыка будзе мэханізавана.

Апрача гэтага, для віцебскіх, гомельскіх і менскіх мэталёапрацоўчых заводаў ужо атрымана шэраг новых машын, для выбару якіх выяжджаў заграніцу загадчык Белмэтгрэсту.

Частка атрыманых машын будзе выраблянь розную мэталёвую галянтарэю і тэкс (шавецкія цьвікі).

Напярэдадні ўсебеларускай сялянскай спартакіяды.

На мясцох падрыхтоўка да ўсебеларускай сялянскай спартакіяды скончана. З 25 ліпеня да 8 жніўня будуць праводзіцца раённыя зьезды фізкультурнікаў, а з 8 да 15 жніўня—акруговыя. Кожны акруговы савет фізкультуры прышле на спартакіяду 25 фізкультурнікаў—15 мужчын і 10 жанчын. Урачыстае адчыненьне спартакіяды адбудзецца 18 жніўня; спартакіяда працягнецца 5 дзён.

На спартакіяду запрошаны ўсе саветы фізкультуры Саюзу.

Спатканьне ўдзельнікаў усебеларускага вэлёпрабегу.

Спатканьне ўдзельнікаў усебеларускага вэлёпрабегу ў Менску гарадзкімі вэлёсыпэдыстамі і фізкультурнікамі адбудзецца 4 жніўня а 12 гадз. дню на Пляцу Волі.

КІНО „КУЛЬТУРА".

„ШУКАНЬНЕ ДОЛІ".

Эпоха паншчыны на Украіне зноў паказваецца ў гэтым фільму вытворчасьці ВУФКУ, але прадстаўлена яна шаблённа. Ад благіх паноў уцякаюць прыгонны Астап і пакаёўка Саламея. Яны ўцякаюць у Румынію, каб там знайсьці долю, але гэта ня лёгка—няма долі і за ёю трэба ісьці, ісьці...

Такі сюжэт фільму. Разгорнут ён непераканваюча і ня цікава. Перш за ўсё—слаба матываваны ўцёкі. Адбывалі сяляне паншчыну—секлі дровы для пана пад наглядам прыгнятага. Бадай нічога не рабілі і больш ад гультайства як ад цяжкай працы, захацелі адпачыць і пакурыць. Тут здарылася сварка між Астапам і прыгнятым. Прыгнаты данёс пану, а той загадаў здаць Астапа ў „маскалі". Астап уцёк, а з ім і яго каханка Саламея.

Загад пана—наладзіць пагоню і адшукаць уцекача—выконваецца так, што зусім не закранае і не хвалюе гледача.

На румынскай граніцы, зразумела, стаіць царская варта, аднак-жа з фільму вынікае, што ўцёкі заграніцу—справа вельмі лёгкая. У Румынії ўцекачы трапілі да цыганоў. О, гэта вельмі благія людзі: канакрады, абібокі, гультаі... Зразумела, за гэта іх прасьледуе паліцыя. Папярэджаны Астап усё-ж не ўцякае ад бяды і трапляе ў турму.

Далей фільм разгортваецца са значным налётам дэтэктыву. Саламея з другім „урусам" па дарозе нападаюць на варту і выратоўваюць Астапа, якога паліцыя хацела перакінуць назад праз граніцу. Гэтае вызваленьне варта таксама ўсяго мастацкага афарміленьня фільму, зьяўленьне якога на экране нічым не апраўдваецца.

Фільм сам па сабе—гэта „прымусовы асартымэнт" да гастроляў Пай. Пай выконвае рад даволі цікавых фокусаў, але ёсьць і некаторыя вельмі затасканыя (са скрыпяю). Пай абяцае ў канцы гастроляў выкрыць свой сакрэт. Анак і цяпер можна выкрыць „мэтамарфозы" ў скрыні: скрыня мае бок, які адчыняецца. У гэтым сакрэт „мэтамарфоз".

Ґаб.

Суд.

Новая вылазка клясавага ворага ў Заслаўскім раёне.

Змаганьне вясковай беднаты за лепшае жыцьцё шляхам утварэньня буйных арцеляў, калгасаў, машынных таварыстваў і г. д.—непакоіць кулакоў і іншых клясавых ворагаў.—Ня так даўно ў Заслаўскім раёне кулакі зрабілі замах на жыцьцё шчырага працаўніка ў галіне абзяднаньня лясоў мясцовай значнасьці Міхася Дударычка, які ўпарта абараняў інтарэсы вясковай беднаты і батрацтва. Кулакі з вёскі Барсукі, якія зрабілі замах на Дударыка, панесьлі заслужаную кару, але кулачко не супакоілася. Другай ахвярай помсты клясавых ворагаў зьявілася забойства лясьніка Заслаўскага лясьніцтва—камсамольца Комара. Сьледзтва па справе Комара яшчэ вядзецца. Трэці тэрарыстычны акт—абрабаваньне і забойства старшыні Недранскай малочнай арцелі т. Хвадзеява ўночы на 5 чэрвеня г. г. на шляху паміж вёскамі Шчарбені і Гарошкі Заслаўскага раёну.

Акалічнасьці гэтай справы наступныя:

У вёсцы Недранск па ініцыятыве Хвадзеева, як барацьбіта за новае жыцьцё, была арганізавана малочная арцель. Старшынёю праўленьня арцелі быў абраны Хвадзееў, які старанна і сумленна павёў працу, вярбуючы новых членаў арцелі з вясковай беднаты і серадняцкіх пластоў.

Ужо сёлета малочная арцель мела досыць значны збыт сваёй прадукцыі на менскі рынак.

За малако, якое здавалі ў арцель сяляне, Хвадзееў разьлічваўся кожны месяц, дастаўляў сваім членам-пайшчыкам з Менску макуху і інш. Адным словам, малочная арцель пашыралася.

Мясцовыя кулакі—Мікалай Казлоўскі і Сяргей Раманоўскі воража адносіліся да арцелі, прабавалі агітаваць сярод сялян, каб не здавалі малака, даказвалі сялянам, што Хвадзееў нажываецца, але беднота ня слухала кулакоў і лічыла Хвадзеева старанным і сумленным старшынёй арцелі.

5-га чэрвеня г. г., калі Хвадзееў вяртаўся з Менску, дзе прадаў масла на 410 руб., на шляху паміж вёскамі Шчарбені і Гарошкі яго затрымалі кулакі падхалімы Мікола Макарэвіч, Алесь Малініовіч і Хведар Пепік, узброеныя адрэзам і сякерай, заблі Хвадзеева і забралі арцельныя грошы ў суме 410 руб.

На забойства Хвадзеева бандытаў падбухторыў Мікола Казлоўскі, а патроны да стрэльбы даў Раманоўскі.

Па хадайніцтву сялян—пайшчыкаў арцелі і грамадзкіх арганізацый Заслаўскага раёну справа над бандытамі-забойцамі Хвадзеева будзе разглядацца выязной сэсіяй Менскага акруговага суду 16-га жніўня г. г. у м. Заслаўі ў паказальным парадку з удзелам пракурора.

Д. М.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 27-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 пр. зал. выйгр. паз.	4.83	
Бясспроц. выйгр. пазыка 1926 г.	127,25	129.25
10 проц. дзярж. пазыка 1927 г.	100.59	100.99
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	26.15	26.25
3-я сялянск. выйгр. паз.	27 г. 5.04.5	—
12 проц. дзярж. унутр. паз, 1927 г.	10.57	10.62
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	25.72	25.82
2-ая 6 проц. выйгр. паз.	26.87,5	26.97,5
Пазыка індустр.	26.11,5	26.21,5
11 проц. дзярж. унутр. пазыка 1928 г.	104.43	104.42
Пазыка 1929 г.	101.83	—

Апавяшчэньне.

САД АСЬВЕТЫ.

Сёньня ў садзе вечар фізкультуры. Пач. а 8 г. ув. Уваход на саюзных і клюбных кніжках. У разе дрэннай пагоды перанясіцца ў дом.

Час. выкон. абав. адказн. рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

БАЛЯНС ПОЛАЦКАГА АКРУГ. АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА

на 1-га кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ.

СТАЦЬЦІ БАЛЯНСУ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная	% % да балянсу
Грашовыя сродкі:			
1. Каса	338—32		0,31
2. Бягучыя рахункі	69—67	407—99	0,06
3. Каштоўныя паперы:			
Абл. 6% пазыкі	180—		
Абл. 8% гар. паз.	3.336—26	3516—26	3,27
4. Тара		931—66	0,86
5. Тавары: (па сабекошту).			
На складзе	38.139—73		
у аптэках	22.991—39		
у магазынах	17.064—94	78.196—06	72,89
6. Лекрасьлины		700—16	0,65
7. Інвэнтар		11.074—96	10,31
8. Вэксалі ў вучоце		6.500—	6,05
9. Паі ў Сельбанку		200—	0,18
10. Падсправаздачн. асоб.		170—64	0,15
11. Дэбіторы:			
а) дзярж. установы	4.520—13		
б) каапэрац.	271—97		
в) прыватн. асобы.	57—68		
г) служачыя	139—85	4.989—63	4,64
12. Выдаткі будуч. часу		682—71	0,63
БАЛЯНС		107.370—07	100

ПАСЫЎ.

СТАЦЬЦІ БАЛЯНСУ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная	% % да балянсу
1. Капіталы:			
а) асноўны	4168—83		
б) зваротны.	31.753—44		
в) запасны	4.212—20	40.134—47	37,47
2. Фонды:			
а) амартызацыйны	1.040—62		
б) паленш. быту служ.	1.111—10	2.151—72	2,0
3. Вэксалі выданыя		37.370—49	34,89
4. Банкі па вучоту		6.500—	6,05
5. Пазыка ад залог		111—13	0,10
6. Падсправаздачн. асоб		2—03	—
7. Служачыя		1.350—52	1,26
8. Крэдыторы:			
а) дзяржустановы.	13.136—04		
а) каапэратыўныя.	845—17		
в) прыватныя асобы	267—60	14.248—81	13,30
9. Прыбытак за 1927-28 г.		5.[illegible]—90	[illegible]
БАЛЯНС.		107.370—07	100

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

ДЭБЕТ

	СУМА
Агульна-адміністрац. выдаткі	10816—28
Гандлёвыя выдаткі	66831—55
Проц. аплачаныя	4923—58
Страта ад безнадзейных даўгоў	38—76
Розныя страты	10—34
Прыбытак за 1927-28 г.	5500—90
РАЗАМ	88121—41

КРЭДЫТ

	СУМА
Прыбытак ад рэалізацыі тавараў	88069—83
Розныя прыбыткі	51—58
РАЗАМ	88121—41

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРЫБЫТКАЎ

У прыбытковы падатак 10 проц.	550—09
На забясьпечаньне калгасаў аптэчкамі Астатнюю суму:	440 —
У мясцовы бюджэт 70 проц.	3157—57
У фонд паленшаньня быту служачых 10 проц.	451—08
У зваротны капітал 20 проц.	902—16
РАЗАМ	5500—90

Загадчык